Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Шатар'я прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапатрабаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэй шасьця тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарэй пасьлядняй тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарэй перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя ня 50 проц. дарожэй.
Знак тарыфу бярэцца 10 проц. шэкэтэ.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт . . . 25 кап.
За кожны дадатковы . . . 15 „
Бесплатныя і чырвонаармейцы
за дакумэнт . . . 15 „
За кожны дадатковы . . . 5 „
Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 58 (2547) Чацьвер, 14-га сакавіка 1929 г.

ПАСЕЎКАМПАНІЯ Ў РСФСР РАЗЬВІВАЕЦЦА ПАСЬПЯХОВА.

МАСКВА, 11-III. Апошняе пасяджэньне Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету РСФСР было прысьвечана заслуханьню і абмеркаваньню падрабязнага дакладу члена калегіі Наркамзему т. Квірынга аб праробленай працы да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Пасьля выступленьня шэрагу членаў ураду і прадстаўнікоў асобных райёнаў старшынствуючы т. Ляжава, рэзюмуючы спрэчкі, адзначыў, што Наркамзем прыняў своечасовыя меры да правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі. Прынятыя Наркамземам мерапрыёмствы знаходзяцца ў адпаведнасьці з дырэктывамі ўраду РСФСР. Аднак, сур'ёзныя задачы, выкліканыя в пасевамі, патрабуюць ад усіх установаў і арганізацый далейшае неаслабнае ўвагі

Т. Ляжава далей спыняецца на некаторых недахопах адміністрацыйных укілах пры правядзеньні масавых агрыкультурных мерапрыёмстваў.

Пры разьмеркаваньні мінэральных угнаеньняў у гэтым годзе былі дапушчаны некоторыя памылкі, якія прывялі да таго, што адны райёны атрымалі ўсе 100 проц. патрабнага, а іншыя—не атрымалі і дзесятай долі пададзеных заявак.

Адзначыўшы своечасовасьць праведзеных Наркамземам мерапрыёмстваў да пасеўнай кампаніі, СНК РСФСР на аснове абмену думак і прапаноў НК РСІ прапанаваў спэцыяльнай камісіі пад старшынствам т. Квірынга выпрацаваць па гэтаму пытаньню праект пастановы СНК.

Апошнія дні працэсу Грамады.

Асоба здрадніка Астроўскага высьветлена яскрава.

ВІЛЬНЯ, 10-3 Пасьля адваката Сьмяроўскага на працэсе Грамады выступалі абаронцы Бабянскі, Абрамовіч, Пятрусэвіч і Дурач. Канец прамоў абароны чакаецца ў чацьвер. Прысуд будзе ўхвален не раней пятніцы. Усе абаронцы разьвівалі ў сваіх прамовах адну ідэю, што ад прысуду ў значнай меры залежыць, як складуцца ў бліжэйшы час дачыненьні паміж польскай дзяржаўнасьцю і беларусамі. На думку абаронцаў, працэс можа паслужыць выходным пунктам для пералому настрояў беларусаў на карысьць Польшчы. Бабянскі абвінавачваў польскую грамадзкасьць у тым, што яна ня ўлічыла настрою беларускіх мас, якія вельмі пакутавалі ад жабрацтва, што дапамагала вялізнаму росту Грамады. Абрамовіч (сэнатар, член блёку супрацоўніцтва з урадам) заявіў, што польскі ўрад перакінуў мост беларусам і ад прысуду залежыць, ці застанецца гэты мост, ці зруйнуецца. Пятрусэвіч зазначыў, што ГРАМАДА ЛІКВІДАВАНА ТОЛЬКІ ФАРМАЛЬНА, АЛЕ НЯ СПЫНЯЕ СВАЙГО ІСНАВАНЬНЯ І НА ВЫБАРАХ У СОЙМ САБРАЛА СТО ТЫСЯЧ ГАЛАСОЎ, з чаго і належыць зрабіць адпаведныя практычныя вывады.

ВЕЛЬМІ ХАРАКТЭРНЫ ПРЫЁМЫ, ЯКІЯ ЎЖЫЎ ПЯТРУСЭВІЧ ПА АБАРОНЕ АБВІНАВАЧАНАГА АСТРОЎСКАГА. У ЯКАСЬЦІ ДОКАЗУ АБ ЯГО НЯВІНОЎНАСЬЦІ ПЯТРУСЭВІЧ СПАСЛАЎСЯ, ШТО Ў 1917 г. АСТРОЎСКІ БЫЎ КАМІСАРАМ УРАДУ КЕРАНСКАГА, А ПОТЫМ ДЭНІКІНЦАМ І СУПРАЦОЎНІЧАЎ З ПАЛЯКАМІ. ДАЛЕЙ ПЯТРУСЭВІЧ ПАДКРЭСЬЛІЎ, ШТО Ў ГІМНАЗІІ, ДЫРЭКТАРАМ ЯКОЙ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСТРОЎСКІ, АПОШНІ ВЕЛЬМІ ГРУБА І З АГІДАЮ ДАВАЎ ВОДЗЫВЫ АБ ВУЧЭНЬНІ МАРКСА.

Пятрусэвіч падаў вытрымкі з дакладу Астроўскага інспэктару вучэбнага акругу, у якім гаворыцца: „Па сканчэньні асьветы ў гімназіі беларуская моладзь ахвяроўваецца на дэмаралізацыю, ці прымушана эміграваць у СССР, ці ў Чэха-Славакію, таму што польскія ўнівэрсытэты яе ня прымаюць".

У канцы Пятрусэвіч прасіў суд улічыць, што ў аднэй з каністычных адозваў Астроўскага называюць здраднікам інтарэс беларускага народу.

БАРАЦЬБА ПРОЦІ ФАШЫЗМУ.

ГАЛОЎНЫМ АБАРОНЦАМ ФАШЫЗМУ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ.

БЭРЛІН, 11-3. У зьвязку з антыфашысцкім кангрэсам, які адбываецца ў Бэрліне, учора ў цырку Буша адбыўся масавы антыфашысцкі мітынг бэрлінскіх рабочых.

Масавы мітынг у цырку быў адчынен генэральным сэкратаром Міжрабпому Мюнцэнбергам. Пасьля выступленьняў Вільгельма Піка і Анры Барбюса, спатканага авацыямі і сьпевамі Інтэрнацыяналу, і прадстаўнікоў Францыі і Злучаных Штатаў, в заключнай прамовай выступіў Мюнцэнберг. Агалашэньне ліста сацыял-дэмакратычнага паліцэй-прэзыдэнта Царгібеля, якое забаранае розныя дэманстрацыі, выклікала бурныя пратэсты з боку ўдзельнікаў мітынгу. Мітынг скончыўся сьпевамі Інтэрнацыяналу.

Паліцыя выключна груба вяла сябе пры выхадзе вялізных мас з памяшканьня цырку. Прысутнічаўшы на мітынгу Макс Гельц быў арыштаваны за невыкананьне загаду паліцэйскіх.

Нават буржуазны друк адзначае выклікаючыя і бессэнсоўныя паводзіны паліцыі. Левая вячорняя газэта «Вельт аб Абэнд» падкрэсьлівае, што надзеі, якія адбываліся ўчора, навочна даказалі чужаземным дэлегатам кангрэсу, што і ў Нямеччыне фашызм, абапіраючыся на сацыял-дэмакратыю, пераходзіць у наступ.

Дэманстрацыя супроць фашызму ў Вене.

У нядзелю ў Вене адбылася антыфашысцкая дэманстрацыя, у якой прынялі ўдзел звыш 4-х тысяч рабочых. Акроч камуністаў і беспартыйных, у дэманстрацыі ўдзельнічалі таксама шмат сацыял-дэмакратычных рабочых, ня гледзячы на тое, што цэнтральны камітэт сацыял-дэмакратычнае партыі „перасьцерагаў" ад удзелу ў дэманстрацыі. Перад дэманстрацыяй адбыліся некалькі масавых мітынгаў, на якіх выступалі камуністы, беспартыйныя і сацыял-дэмакратычныя рабочыя. Прамоўцы падкрэсьлівалі рост фашысцкае небясьпекі ў Аўстрыі і здрадніцкую палітыку сацыял-дэмакратычных лідэраў. На мітынгах было, між іншым, пастаноўлена паслаць прывітальныя тэлеграмы міжнароднаму антыфашысцкаму кангрэсу ў Бэрліне і Камінтэрну. У часе дэманстрацыі былі арыштаваны 2 рабочыя.

РАБОЧЫЯ ДАРУЧАЮЦЬ КАМУНІСТАМ АБАРОНУ СВАІХ ІНРАРЭСАЎ.

БЭРЛІН, 13-3. У Эсэне адбылася скліканая левым раваюцыйным крылом делегацкая канфэрэнцыя прафсаюзаў гарнякоў Рурскае вобласьці. У канфэрэнцыі прынялі ўдзел каля 700 делегатаў, сярод якіх былі камуністы, сацыял-дэмакраты і беспартыйныя. Ухваленая канфэрэнцыяй рэзалюцыя даручае акруговаму камітэту камуністычнае фракцыі прафсаюзу дзейнічаць у якасьці камітэту барацьбы для неадкладнага прыняцьця падрыхтоўчых мер да выступленьня за павялічэньне зарплаты і скарачэньне рабочага дню.

ФРАНЦЫЯ НЕЗДАВОЛЕНА ПРАЭКТАМ РЭПАРАЦЫЙНАГА БАНКУ.

ПАРЫЖ, 11-3. Афіцыйныя паведамленьні камісіі экспэртаў аб праэктуемым міжнародным банку ня зьніччыла боязьні французкага друку аб надзвычайным фінансавым і палітычным значэньні рэпарацыйнага банку і аб наўхільнасьці кіраўнічай у ім ролі Амэрыкі.

„Эко дэ Пары" заявляе: „Было-б вельмі наіўна думаць, што праектуемы банк ня будзе нацыянальным, і што гэты звышбанк ня будзе аказваць палітычнага нажыму на шкоду нацыянальным інтарэсам асобных дзяржаў".

Побач з боязьню па сутнасьці праэкту ўвесь французкі друк ня ўкойвае сваёй крывогі як в прычыны цьвёрдасьці, з якою Нямеччына адмаўляецца наблізіць свае канкрэтныя прапановы аб разьмеры і колькасьці штогодніх узносаў, так і в прычыны варожасьці, з якой нямецкі друк сустракае перспэктыву ператварэньня нямецкага паліцэйоўгу ў камэрцыйны.

САМАЙЛОВІЧ І ЧУХНОЎСКІ Ў БЭРЛІНЕ.

БЭРЛІН, 11-III. Праф. Самайловіч і лётчык Чухноўскі ўчора ўвечары выступалі ў залі дзяржаўнае ратушы з дакладамі аб выратаваньні экспэдыцыі Нобіле. Заля ратушы была настолькі перапоўнена, што паліцыя спыніла доступ яшчэ загадзя да пачатку дакладаў. Дакладчыкам былі наладжаны бурныя авацыі.

БАРАЦЬБА ПОЛЬСКАГА ЎРАДУ З СОЙМАМ.

Сэнат адхіліў асыгнаваньні на выдаткі Пілсудзкага. Урад выдатка-ваў дзяржаўныя сродкі бяз ведама і згоды сойму.

Заслона польскае „дэмакратыі" расчыняецца.

ПРЭЗЫДЫУМ САВЕТУ МІНІСТРАЎ ВЫДАТКАВАЎ У 4 З ПАЛОВАЮ РАЗЫ БОЛЬШ СРОДКАЎ, ЧЫМСЯ БЫЛО ЎСТАНОЎЛЕНА БЮДЖЭТАМ.

ВАРШАВА, 12-3. У зьвязку са справаю ранейшага міністра фінансаў Чэховіча аб перавыдаткаваньні сродкаў, дапушчаным урадам, орган эндэкаў «Газэта Варшавска» апублікавае даныя, якія расчыняюць заслону над тайнай, што перашкаджае ўраду даць сойму дакладную справаздачу аб перавыдаткаваных сумах.

Газэта даказвае, што прэзыдыум савету міністраў выдатка-ваў у 4 з паловаю разы больш сродкаў, чым было прадугледжана бюджэтам. Перавыдаткавана звыш 8 мілёнаў злотых. Газэта падкрэсьлівае, што ўвесь гэты перавыдатак быў зроблен у сьнежні і студзені і, галоўным чынам, у лютым 1928 г., калі адбывалася падрыхтоўка да перавыбараў сойму, і адзначае шчыльную сувязь паміж выдаткаваньнямі 8 мілёнамі злотых у сувязі з выбарчай кампаніяй.

Правал Пілсудзкага ў сэнаце.

БОЛЬШАСЬЦЮ 48 ПРОЦІ 46 АДХІЛЕНА ПРАПАНОВА АБ 2-МІЛІЁН. ФОНДЗЕ НА ВЫДАТКІ ПІЛСУДЗКАГА

ВАРШАВА, 12-3. Пленум сэнату адхіліў прапанову аб аднаўленьні 2-х мілённага фонду на прадстаўніцкія выдаткі вайсковага міністра Пілсудзкага. Гэтая пастанова 48 галасамі супроць 46 выклікала вялікае ўражаньне ў палітычных колах. Стварылася нечаканае становішча, што сэнат фармальна выказаў недаверье Пілсудзкаму за яго індаўную прамову ў сэнаце аб „вясёлых бюджэтах", якія трацяцца на прастытутак і п'янкі. Неадкладна пасьля галасаваньня ў сэнаце адбылася нарада з удзелам прэм'ера Бартэля, Пілсудзкага і старшыні сойму Дашынскага. У палітычных колах схільны прыпісваць гэтай нарадзе сур'ёзнае значэньне.

Прызнаньне СССР няўхільна

ЗАЯВА СЭНАТАРА БОРА.

ВАШЫНГТОН, 11-3. У гутарцы з прадстаўнікамі друку сэнатар Бора заявіў, што замежная палітыка Гувэра, абгрунтаваная на пашырэньні ўнутранага гандлю, няўхільна прывядзе да хуткага прызнаньня СССР.

«Замежна-гандлёвая палітыка—сказаў Бора—будзе няўхільнай, калі яна адкіне ад агульнае сумы 160 мілёнаў чалавек, якія насяляюць адну шостую частку сьвету».

ПАРАЖЭНЬНЕ РЭФАРМІСТАЎ НА БЭРЛІНСКІХ ТЭКСТЫЛЬНЫХ ПРАДПРЫЁМСТВАХ.

БЭРЛІН, 10-3. Кампанія перавыбараў фабзавкомаў штодзень прыносіць новыя посьпехі рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў. Рэфармісты пацярпелі буйнае паражэньне на бэрлінскіх тэкстыльных прадпрыёмствах. Тэкстыльшчыкі ў адказ на анты-рабочую палітыку рэфармістаў, якая выявілася за апошнія месяцы ў прыняцьці 21 абавязковай пастановы трацейскіх інстанцый, выбіраюць фабзавкомы, якія падтрымліваюць рэвалюцыйнае крыло. Наперакор рэпрэсіям на 9 бэрлінскіх тэкстыльных прадпрыёмствах абраны фабзавкомы, якія складаюцца цалком з прыхільнікаў рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў. Адначасова сярод рабочых мас узмацняецца рух проці раскольніцкае палітыкі рэфармістаў. Сёньня ў Эсэне адчыняецца акруговая канфэрэнцыя гарнякоў-прыхільнікаў рэвалюцыйнага крыла, выбары дэлегатаў на якую адбыліся ўсюды з вялізным посьпехам.

У КІТАІ БАРАЦЬБА ГРУПОВАК НЯ СПЫНЯЕЦЦА

ШАНХАЙ, 11-III. Лі-Цзун-Жэн, старшыня ўханскае палітычнае рады, які займае таксама шэраг буйнейшых пасад у партыі і ва ўрадзе, падаў у адстаўку. У сваёй заяве, як на адну з прычын сваёй адстаўкі, ён зазначае, што нанкінскі ўрад, на гледзячы на цяжкасьці, з якімі быў вахаваны мір напярэдадні апошнае нарады вайсковых лідэраў, будучы незадаволены рэарганізацыяй у правінцыі Хунань (месцца на ўваве адхіленьне гуанскімінпрыхільнікамі Чан-Кай-Шы ў ханскім урадзе), правёў мабілізацыю і перасоўку войска, адпусьціўшы на гэта сродкі, прызначаныя для дэмабілізацыі. У адказ на гэту заяву Чан-Кай-Шы паслаў Лін-Цзун-Жэну востры ліст, у якім гаворыцца, што нанкінскі ўрад прымушан быў правесьці мабілізацыю, бо ён ня мог дазволіць месцам ігнараваць пастанову цэнтру, прымаючы пад увагу, што «годнасьць нацыянальнага ўраду павінна заставацца на вышыні».

Водлуг вестак „Норт Чайна Дэйлі Ньюс", паведамленьне аб адстаўцы Лі-Цзун-Жэна зрабіла вельмі непрыемнае ўражаньне на кітайскія колы Шанхаю, якія бачаць у гэтым крок да вайны між гуанскаю групоўкаю і Чан-Кай-Шы. Наадварот, у колах блізкіх да нанкінскага ўраду лічаць, што сваёю адстаўкаю Лі-Цзун-Жэн падкрэсьліў лёяльныя адносіны да Нанкіну і што вайна можа быць папяроджана.

ПЕРАД ЗЬЕЗДАМ ГАМІНДАНУ.

ШАНХАЙ, 12-III. З-ці зьезд Гамінданду павінен адчыніцца 15 сакавіка, але з 356 делегатаў у Нанкін пакуль што прыбыло толькі 40. Мясцовымі арганізацыямі Гамінданду абрана 89 делегатаў, выканкоман—116, акроч таго 151 делегат назначаны выканкомам. Для кворуму неабходна прысутнасьць паловы делегатаў. Калі які-небудзь делегат ня зможа прысутнічаць на зьезьдзе, выканком мае права назначыць яму намесьніка. Цзянянская арганізацыя Гамінданду заявіла пратэст проці насаджэньня делегатаў выканкомам углядаючы ў гэтым парушэньне асноўных прынцыпаў партыі.

У АФГАНІСТАНЕ.

СТАНОВІШЧА АМАНУЛЫ ЎМАЦОЎВАЕЦЦА.

ТЭГЕРАН, 11-3. Тэгеранскі карэспандэнт «Чыкаго Трыбюн», які вярнуўся з падарожжа ў Афганістан, паведаміў мясцовай газэце «Эттэлаат», што водлуг яго ўражаньняў, становішча Аманулы ў Кандагары і ў усходняй часьці Афганістану вусім здавальняючае; войска Аманулы пасоўваецца на Кабул, але апэрацыі прыпыняюцца з прычыны вялікае колькасьці сьнегу.

Цяжкасьці Гувэра.

ВАШЫНГТОН, 11-3. У лісьце Гувэра, якім ён склікае надзвычайную сэсію кангрэсу на 15-га красавіка, зазначаецца, што сэсіі належыць абмеркаваць законапраэкты аб аказаньні дапамогі фэрмэрам і аб частковым перагляде мытных тарыфаў. Мяркуюць, што скліканьне сэсіі будзе прычынаю канфлікту паміж прамысловцамі, патрабуючымі пашырэньня пратэкцыянізму (урадавых мытаў) і інш. групоўкамі.

НОВЫЯ ЗЬВЕНЬНІ.

Не пасьпеў яшчэ адшумець скандал, які зьявіўся ў выніку выкрыцьця патаемнае франка-бельгійскае згоды, як на паверхню палітычнага жыцьця выплылі новыя зьвеньні таго-ж ваеннага ланцугу, які бязупынна куе англа-французкі імпэрыялізм. Мы маем на ўвазе, папершае, выкрываньні літоўскае ўрадавае газэты «Летувос Айдас» аб патаемным угаворы паміж Польшчаю і Румыніяй. Падругое, абгаварэньне на сэсіі рады Лігі Нацый праэкту Фінляндыі аб аказаньні міжнароднае фінансавае дапамогі „дзяржаве, падпаўшай нападу".

Водлуг паведамленьня „Летувос Айдас", патаемны польска-румынскі ўгавор падпісан польскім вайсковым міністрам і начальнікам румынскага генэральнага штабу ў Бухарэсьце 1 кастрычніка 1928 году. Ён абавязвае Польшчу і Румынію супольна прыняць удзел ва ўзброеным нападзе на СССР. Ён прадугледжвае пасылку СССР пагражаючага ультыматуму, каб у патрэбны момант была прычына для нападу.

Гэтыя выкрываньні «Летувос Айдас», мажліва, ня вусім дакладныя. Магчыма, што яны яшчэ ня выкрываюць усіх да гэтага часу невядомых падрабязнасьцяй польска-румынскага ваеннага ўгавору. Аднак, самы факт такога ўгавору і яго супрацьсавецкая сутнасьць даўно ўжо не зьяўляюцца для нас сакретам.

Румынскі міністр чужаземных спраў сам шмат разоў заяўляў аб існаваньні польска-румынскага саюзу. Шматлікія афіцыйна зарэгістраваныя нарады польскіх і румынскіх генэралаў у Варшаве і Бухарэсьце навочна сьведчаць, што польска-румынскі саюз зьяўляецца ваенным саюзам. А што гэты ваенны саюз накіраваны супроць СССР, відаць хоць-бы з таго, што і ў варшаўскіх і ў бухарэсцкіх нарадах удзельнічалі ангельскія і французкія афіцэры.

Уся палітыка англа-французкага імпэрыялізму ў суседніх з намі дзяржавах зводзіцца імкнна да таго, каб у адпаведны момант скарыстаць нашых суседзяў для нападу на Савецкі Саюз. І толькі што выкрыты «прадукт» гэтай палітыкі—польска-румынскі ўгавор—зьяўляецца адным са зьвеньняў у цэлай сетцы супрацьсавецкіх ваенных дагавораў, якую Англія і Францыя ткуць па ўсёй Эўропе.

Характэрна, што польска-румынскі ўгавор падпісан 1 кастрычніка 1928 г. Гэта значыць, што Польшча і Румынія дагаварыліся аб нападзе на СССР як раз праз месяц пасьля таго, як яны падпісаўшы пакт Келёга, узялі на сябе абавязацельства назаўсёды адмовіцца ад усякіх узброеных выступленьняў супроць якой-небудзь дзяржавы.

Мала таго. 9 лютага 1929 году польскі і румынскі ўрад, як відома, падпісалі в намі маскоўскі пратакол аб неадкладным правядзеньні ў жыцьцё пакту Келёга ў адносінах паміж Польшчаю і СССР, Румыніяй і СССР. Іншымі словамі, Польшча і Румынія ўжо проста абавязаліся не ваяваць супроць СССР. Аднак, амаль што на другі дзень пасьля падпісаньня маскоўскага пратаколу на нарадзе польскага і румынскага міністраў замежных спраў у Варшаве было пастаноўлена аб далейшым разьвіцьці польска-румынскага ваеннага саюзу, г. зн. аб далейшай падрыхтоўцы да вайны супроць СССР.

Вось яна цана мірным абавязацельствам буржуазеі. І Польшча, і Румынія, і іх англа-французкія гаспадары імкнуцца скарыстаць гэтыя мірныя абавязацельствы выключна для таго, каб прыкрыць свае падрыхтаваньні да вайны.

Літаральна такі-ж сэнс мае і фінляндзкі праэкт міжнароднае згоды аб фінансавай дапамозе „дзяржаве, падпаўшай нападу". Праэкт абгаварваецца ў Лізе Нацый яшчэ в 1926 г., і ўрад Фінляндыі в вельмі дзіўнаю ка-стоўлівасьцю дамагаецца яго ажыцьцяўленьня. Адгэтуль, як быццам, вынікае, што Фінляндыя перш усяго сябе лічыць дзяржаваю, якой пагражае напад. Але пытаньне, адкуль, з якога боку чакае нападу фінляндзкі ўрад?

Адказ на гэта дае другі фінляндзкі праэкт, які быў абгаворан у Лізе Нацый таксама яшчэ ў 1926 г. і прапанаваў, каб у выпадку сутычкі паміж дзяржаваю, уваходзячаю ў Лігу Нацый, і дзяржаваю, не ўваходзячаю ў Лігу, нападаючаю абавязкова лічылася дзяржава, не ўваходзячая ў Лігу. З усіх суседзяў Фінляндыі ў Лігу не ўваходзіць толькі СССР. Значыцца, патрабуючы міжнароднага фінансавага падтрыманьня, Фінляндыя па сутнасьці абвяшчае, што ёй пагражае напад з боку СССР.

Зразумела, у сапраўднасьці ніякі напад ёй з нашага боку не пагражае. Бо ўрад СССР першым прапанаваў Фінляндыі (і іншым суседнім дзяржавам) утварыць дагавор аб ненападзе. Аднак, Фінляндыя гэту прапанову адхіліла. Фінляндыя, акроч таго, да гэтага часу не далучылася да пакту Келёга і да маскоўскага пратаколу.

Усё гэта дае нам права зрабіць вывад, што пад шумок паклёпніцкіх размоў аб нападзе, быццам пагражаючым ёй з боку СССР, Фінляндыя сама рыхтуецца да нападу на СССР. Зразумела, у гэтай адносіне фінляндзкі ўрад выступае толькі як наёмны агент Англіі. Подарма Англія ўзмоцнена ўзброівае Фінляндыю, удзельнічае ў арганізацыі яе паветранага флёту, абяцае ёй дапамагчы сваім марскім вайсковым флётам. Фінляндзкі ўрад намічае нават пераабсталяваньне сваіх партоў спэцыяльна для таго, каб у іх маглі спыняцца і рамантавацца ангельскія вайсковыя судны.

Натуральна, што пры гэтых умовах і Чэмберлен і Брыян ухвальваюць і вітаюць фінляндзкі праэкт аб міжнароднай фінансавай дапамозе.

І. С.

ПАЎСТАНЬНЕ Ў МЭКСІЦЫ.

ПАЎСТАНЦЫ ХОЧУЦЬ АДЛУЧЫЦЬ ПАЎНОЧНЫЯ ШТАТЫ МЭКСІКІ.

НЬЮ-ЁРК, 11-3. Ваеннае становішча ў Мэксіцы малюецца ў наступным выглядзе: у руках паўстаўшых знаходзяцца паўночныя райёны штатаў Чыгуга, Коагіла і Санора. Паўстаўшыя пасоўваюцца на поўдзень, стараючыся злучыцца з паўстанцкім войскам, якое знаходзіцца ў штаце Халіска, што стварыла-б пагрозу для гораду Мэксыко. Урадавае войска заняло Капітао ў штаце Сакатэкас, парваўшы гэтым самым сувязь паміж дзьвюма групамі паўстанцкага войска. Паводле апошніх паведамленьняў, мэксыканскае войска, якое знаходзіцца ў паўднёвай частцы Мэксыканскае Каліфорніі, далучылася да паўстаўшых. Газэта „Уорльд" паведамляе, што паўстанцы равялічваюць умацаванцы ў паўночных штатах і дабіцца адлучэньня іх ад Мэксыкі ў якасьці «самастойнае рэспублікі». Урад Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў падрыхтоўвае пасылку вайсковых частак з унутраных гарнізонаў на мэксіканскую мяжу для ўзмацненьня прыгранічнага войска. Злучаныя Штаты ня спыняюць дастаўкі мэксыканскаму ўраду ваеннай амуніцыі і самалётаў.

ПАЎСТАНЬНЕ ПРЫДУШАНА.

НЬЮ-ЁРК, 12-3. Мэксіканскі ўрад паведамляе, што ўсё паўстанцкае войска ў штаце Вэракрус здалося. Кайзе з сваім войскам пасоўваецца ў напрамку Тарреон і Дуранда. Мэксыканскі ўрад забараніў уезд у гарады, якія знаходзяцца на паўночнай мяжы. Гэта мера ўзмацнае блёкаду, якую праводзяць Злучаныя Штаты ў адносіне дастаўкі харчоў і інш. у райёны паўстаньня.

У Саюзе ССР.

ЛЕНІНГРАДЗКАЯ АБЛАСНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ УХВАЛІЛА ЛІНІЮ АБКОМУ.

ЛЕНІНГРАД, 11-III. Ранішняе пасяджэньне партыйнае канфэрэнцыі адчынілася прывітаньнем ад імя 30.000 інжынэраў і тэхнікаў і ад усесаюзнага зьезду працаўнікоў сельскае гаспадаркі.

У працягу трох пасяджэньняў у спрэчках па дакладзе абласнога камітэту выказалася 45 таварышоў. Усе выступаўшыя адзначалі правільнасьць палітычнае лініі абкому. Абком дамогся здаровага палітычнага стану партыйнае арганізацыі і ўмацаваньня гаспадаркі ў вобласьці. Праца абкому праходзіла па дырэктывах 15-га зьезду і наступных пленумаў.

Праца абкому падвала здаровай крытыцы з боку делегатаў. Больш усяго дасталася, як і на райённых канфэрэнцыях, прафсаюзам.

Іх абвінавачвалі ў кансэрватызьме, руціне, у слабым кіраўніцтве масавай працай і г. д.

Бурнай авацыяй сустрэла канфэрэнцыя заклік т. Кірава. У адказ на прыняцьцё ад вопляскі ўсе канфэрэнцыі рэзалюцыі, канфэрэнцыя ўхвалила правільную і ленінска вытрыманую палітычную і арганізацыйную лінію абкому і яго практычную працу.

РАБОЧЫЯ АБУРАНЫ ПАВОДЗІНАМІ ТРОЦКАГА ЗАГРАНІЦАЙ.

КАЗАНЬ, 10-3. На шэрагу прадпрыёмстваў Казані адбыліся пятучныя рабочыя сходы, якія абмяркоўвалі артыкул т. Яраслаўскага аб паводзінах Троцкага заграніцай. У прынятых рэзалюцыях гаворыцца: «Ганьбім агідны паклёп Троцкага. Ганьба таму, хто прадае за даляры сваё палітычнае аблічэньне, дапамагаючы буржуазеі змагацца супроць СССР і Камінтэрну.

Н. К. КРУПСКАЯ—ГАНАРОВЫ ЧЛЕН БРАНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

БРАНСК, 12-3. Рабочыя 3-яе зьмены кузьнечнага цэху механічнага заводу № 13 аднагалосна абралі ганаровым членам Бранскага Гарсавету Н. К. Крупскую.

ПАШЫРЭНЬНЕ КАПІТАЛЬНЫХ РАБОТ У ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

МАСКВА. ВСНГ Саюзу па ўзгадненьню з ВСНГ БССР устанавіў абхват капітальных работ для БССР на бліжэйшае пяцігодзе ў разьмеры 169.242 тысяч руб. Першапачатковыя капітальныя работы прадугледжваецца разгарнуць толькі на суму ў 136,287 тыс. руб.

Затраты павялічаны, галоўным чынам, для папяровай прамысловасьці, тэкстыльнай і прадпрыёмстваў, якія выпрацоўваюць будаўнічыя матэрыялы.

У плян пяцігадовага будаўніцтва ўключана пабудова: цэлюлёзна-папяровага камбінату, лесапільнага камбінату, трыкатажнай фабрыкі, камбінату драўнянай паперы, фанэрнага заводу і інш.

Для навукова-дасьледчых работ дадатковa асыгнуецца адзін мільён рублёў.

Плюсы і мінусы пасеўкампаніі на Урале.

СЬВЯРДЛОЎСК, 12-3. Пленум Уральскага абласнога Выканкому вынёс асноўныя недахопы пасеўкампаніі. Заўважваецца амаль поўная адсутнасьць масавай працы. Вытворчыя нарады, сельскія і райённыя, працы не разгарнулі. Разам з тым назіраюцца: эканамічнае ўзмацненьне і рост палітычнага ўплыву беднаты, рост шматпольля, разьвіцьцё тэхнічных культур, падвышэньне ўдзельнае вагі абагуленага сэктару сельскае гаспадаркі. Усё гэта рашуча абвяргае ўсе разговы аб «дэградацыі» сельскае гаспадаркі. Урад прыняў праграму пашырэньня пасеўнае плошчы і падвышэньня ўраджайнасьці большую, чым намецію НКЗ. Гэты плян рэальны. Пашырэньне аймага кліну, хоць аймая пасеўная кампанія пачалася позна і сялянскія масы ў яе слаба былі ўцягнуты, вылучыцца найлепшым паказальнікам росту сельскае гаспадаркі.

Новы прыём на курсы марксызму.

МАСКВА, 11-III. ЦК УсеКП(б) пастанавіў прыём на курсы ў 1929-30 навучальным годзе ўстанавіць у 200 чалавек і на камсамольскую групу курсаў у 50 чалавек в тым, каб агульны кантынгент слухачоў курсаў складаўся з 400 чалавек. Прызнаць, што на курсы марксызму павінна быць прынята да 30 проц. жанчын. Устанавіць у якасьці абавязковае нормы пры прыёме на курсы наяўнасьці партстажу ня менш 10 год, пры наяўнасьці ня менш 5 год кіраўнічае працы ў акруговым, губэрскім, абласным і краёвым маштабе, дапускаючы выключэньні для нацыянальных працаўнікоў і ранейшых кіраўнічых камсамольскіх працаўнікоў, кіраўнічых партпрацаўнікоў буйнейшых прамысловых райёнаў і калектываў прыраўняць у адносіне паступленьня на курсы марксызму да працаўнікоў губэрскага маштабу. Даручыць мандатнай камісіі скончыць усю працу па прыёму да 1 лістапада—да пачатку заняткаў на курсах (15 верасьня). Т. е. прынятыя на курсы мясцовыя арганізацыі абавязаны даць месячны водпуск.

Вывучэньне складу рабочых.

МАСКВА, 11-III. У красавіку г. г. УЦСПС распачынае выбарачны перапіс членаў 3-х асноўных індустрыяльных прафсаюзаў—мэталёўцаў, тэкстыльшчыкаў і горнарабочых. Перапіс распачынаецца, галоўным чынам, з мэтаю вывучэньня складу новых кадраў рабочых, уцягнутых у вытворчасьць за апошнія гады. Перапісам будзе ахоплена звыш 500 тысяч рабочых. Уся падрыхтоўчая работа па правядзеньні перапісу ў сучасны момант ужо скончана.

МЫ ПАЧЫНАЕМ АБГАНЯЦЬ КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ.

На Ўсерасейскім зьезьдзе працаўнікоў плянавых органаў, што адбываецца зараз, былі пададзены цікавыя лічбы, якія сьведчаць аб тым, што мы пачынаем абганяць капіталістычныя краіны.

У 1924 годзе на падставе даных Лігі Нацый, СССР па вырабу сыравіны і харчоў перашкаджала сусьветнай вытворчасьці. Бяз СССР сусьветная вытворчасьць дасягала 92 проц. даваеннага ўзроўню, а з СССР толькі 89 проц.

У 1926 годзе сусьветная вытворчасьць сыравіны бяз СССР складала таксама 92 проц., а ўключаючы СССР—ужо 98 проц. Гэта значыць, што вытворчасьць СССР значна павялічыла сусьветны ўзровень вытворчасьці.

СССР таксама нагоняе капіталістычныя краіны і ў прамысловасьці.

Да 1933 году сусьветная здабыча вугалю павінна павялічыцца на 12 проц. у параўнаньні з даваеннай. У прыватнасьці, прадукцыя Амэрыкі на 5 проц., Нямеччыны—на 23 проц.

У СССР здабыча вугалю павялічыцца на 130,5 проц. у параўнаньні з даваеннай.

Прадукцыя сталі да 1933 году павялічыцца ў сусьветным маштабе на 70 проц., у Амэрыцы—на 82 проц., у Францыі—на 89 проц., у Нямеччыне—на 57 проц., у параўнаньні з даваенным.

У СССР прадукцыя сталі да 1933 году павялічыцца на 95 проц.

Лічбы паказваюць, што СССР пачынае нагоняць капіталістычныя краіны і ў галіне вырабу і ўжываньня бавоўны, у чыгуначным транспарце, нафты і інш.

РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ „БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА".

Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» вітае вас з посьпехам у галіне распаўсюджваньня в. газэты сярод шырокіх колаў рабочых і сялян—з 52000 тыражом.

Такая колькасьць падпісчыкаў сьведчыць аб папулярнасьці вашай газэты, аб яе здольнасьці быць арганізатарам савецкае грамадзкасьці і распаўсюджваць ідэі сацыялізму.

Рэдакцыя жадае вам далейшых посьпехаў у працы па арганізацыі савецкай грамадзкасьці і згуртаваньні яе вакол заветаў вялікага правадыра У. І. ЛЕНІНА і яго партыі, якая вядзе ўсіх працоўных да поўнай перамогі сацыялізму.

За цьвёрдую клясавую лінію
ПРЫ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Перагляд сьпісаў пазбаўленых выбарчых правоў

Гэтымі днямі Цэнтральная Выбарчая Камісія рассылае ўсім округам дырэктыву аб правядзеньні праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, а таксама аб праверцы сацыяльнага складу саветаў. З свайго боку Цэнтральная Выбарчая Камісія запатрабавала прысылаць непасрэдна ў камісію з 2-х райёнаў кожнай округі сьпісы сацыяльнага складу сельсаветаў па кожнаму савету, адбіткі сьпісаў пазбаўленых правоў за апошні год і тлумачэньні вымен у параўнаньні з мінулымі выбарамі: асабліва гэта датычыцца тых райёнаў, дзе зараз зауважаецца значнае павялічэньне пазбаўленых, ці наадварот, дзе ёсьць памяншэньне. Таксама будуць выпатрававаны сьпісы пазбаўленых выбарчых правоў 16-ці местачковых саветаў.

Незалежна ад гэтага праверкай займуцца інструктары ЦВК пры выезьдзе на месцы.

Каго пазбавілі выбарчых правоў у Барысаўскім райёне.

Гэтымі днямі выяжджала ў Барысаўскі райён камісія Менскай акруговай выбарчай камісіі, якая правяла абмеркаваньне працы Зембінскай местачковай і Барысаўскай райённай выбарчых камісій. Камісія выявіла цэлы шэраг ляпсусаў, недапушчальных абмылак пры складаньні сьпісаў пазбаўленых выбарчых правоў, нячулы і няўмелы падыход да абіральнікаў.

Вось некалькі фактаў, якія ілюструюць падыход некаторых працаўнікоў на месцах.

У м. Зембіне пазбавілі выбарчага права грамадзянку Паднос Голду і яе дачку Зоб'ю, людзей бедных. Камісія матывавала сваю пастанову тым, што вібыта Паднос Голда таргуе самагонам, хоць, праўда, да гэтага часу Паднос ня прыцягвалася да адказнасьці за гандаль самагонам, але у Зембіне надзвычайна моцна верыць на слова. Таксама пазбавілі выбарчых правоў Розэнблюма Шмуйлу і яго жонку Хаю, як непрацоўны элемент, у той час, як Розэнблюм да 1920 г. у працягу 20-ці год быў рабочым на запалкавай фабрыцы. Ня жанчы з чаго жыць, Розэнблюм перыядычна працаваў па-савгасах, а калі і там ня было работы, ён хадзіў па вёсках і прадаваў з торбы голкі, тыкун, цукеркі.

Нэпман Іцка і яго жонка Сора пазбаўленыя беднякі; нават местачковы савет уключыў іх у сьпіс на выдачы хлеба, але летась нэпманы арандавалі школьны сад, і іх пазбавілі за гэта выбарчага права.

Пазбаўлялі выбарчага права ня толькі паўналетніх, але і асоб, якім у час складаньня сьпісаў ня споўнілася 18-ці год.

Хэйфец Эстра, самсамолка, нарадзілася ў 1911 г., па прафэсіі швачка, але грэх яе заключаецца ў тым, што жыве разам з сваім бацькам бедняком, які без патэнту гандлюе коньмі. Пазбавілі выбарчых правоў Соню Кац, якая нарадзілася ў 1910 г. і зараз працуе ў с.-г. арцелі імя Вароўскага, але мае сувязь з сваёй маткаю-гандляркай.

Такіх фактаў колькі хочаш, але справа ў тым, што выбарчая камісія ня мае ніякіх матар'ялаў, якія маглі-б сьцьвердзіць усе факты, за якія пазбаўлены выбарчых правоў пералічныя вышэй асобы, ня гледзячы на тое, што, водгук 41 арт. Інструкцыі, такія дакуманты павінны быць.

У Барысаўскай райённай выбарчай камісіі справа абстаіць ня лепш. Тут таксама можна спаткаць «важкія» фармуліроўкі і тлумачэньні аб прычынах пазбаўленьня выбарчых правоў.

Напрыклад, гр. в. Навасёлкі Канашэвіча пазбавілі выбарчага права таму, што ён карыстаецца наёмнай сілай «з мэтай паляпшэньня сваей гаспадаркі» і што ён знаходзіцца ў „камбасе", што на мове барысаўчан азначае: каманда басякоў, хоць, праўду кажучы, няма ніводнай спраўкі, якія маглі-б сьцьвердзіць пералічаныя факты.

Наогул, трэба адзначыць, што ў працы райённай выбарчай камісіі назіраецца поўная неразьбярыха.

Зембінская местачковая выбарчая камісія пастанавіла выключыць са сьпісаў пазбаўленых Арона Файтальштэйна, як недасягнуўшага 18 год (нарадзіўся ў 1911 г.) і абмылкова папаўшага ў сьпісы, але райённая камісія, не прачытаўшы нават пастанову местачковай камісіі, без апэляцыйна выносіць наступнае: скаргу Файтэльсона пакінуць без задавальненьня і адмяніць пастанову местачковай выбарчай камісіі.

Па сельсаветах Барысаўскага райёну былі выпадкі, калі пазбаўлялі выбарчых правоў глуханямых толькі за тое, што яны глуханямыя, пазбаўлялі выбарчых правоў утрыманцаў б. паліцэйскіх, ня гледзячы на тое, што яны займаюцца самі сельскай гаспадаркай; праўда, такіх утрыманцаў райённая камісія адмаўляла ў правах, але толькі ў апошні час. У сьпіс пазбаўленых (в. Навасёлкі) уносіліся грамадзяне, „якія таргуюць хатамі і лесам".

Асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў, незалежна ад таго, што яны зьяўляюцца беднякамі, зараз-жа выключаюцца з каапэрацыі і зьнімаюцца з працы.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што райённая выбарчая камісія мала зварачала ўвагі на працу свайго апарату і мала адводзіла ўвагі кіраўніцтву местачковымі і сельскімі выбарчымі камісіямі.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

ПАРЛЯМАНЦКІЯ ВЫБАРЫ У АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 11-3. Водгук вестак палітычных колаў, урад мяркуе назначыць агульныя парляманцкія выбары ў канцы мая, магчыма—на 29-га мая.

ПРАВАКАЦЫЯ ВЫКРЫВАЕЦЦА.

РЭВЕЛЬ, 11-3. Рыскі карэспандэнт «Baba Maa» тэлеграфуе, што паведамленьні рыскага—«Постимес», нібы перахоплены лісты Камінтэрну дэпутатам латвійскага сойму, зьяўляюцца, бязумоўна, правакацыяй, мэтаю якой зьяўляецца спроба абвастрыць савецка-латвійскія дачыненьні.

ПАПЕРА УСЁ ЦЕРПІЦЬ.

ЖЭНЕВА, 4-3. На пасяджэньні рады Лігі Нацый Залескі паведаміў аб ратыфікацыі Польшчай канвэнцыі аб забароне хімічнае вайны.

Штрэзэман заявіў аб надыходзячай у будучым ратыфікацыі гэтае канвэнцыі Нямеччынай.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ У БЭРЛІНІ.

Учора з прычыны 10-гідзьдзя забойства Лео Ігіхэса адбылася дэманстрацыя ля магілахвяр рэвалюцыі на берлінскіх могілках Фрыдрыхсэльдэ. Праведзены арышты.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.
(Ад нашых карэспандэнтаў).

Чырвоны абоз з хлебам.

Магілеў, 13-3. *У нядзелю, 10 сакавіка, у Магілеў прышоў першы ў Магілеўскім райёне чырвоны абоз ў 90 фурманак, які здаў больш 1000 пудоў хлеба. Абоз арганізавала Княжыцкая партыйная ячэйка, якая прыцягнула да працы камсамол, настаўніцтва, вясковы актыў і ахапіла 8 вёсак. На мітынгу, які адбыўся на базарнай плошчы, сялянка з вёскі Бабровіч, Арына Баравікова, сказала:*

— Толькі што мы адсьвяткавалі жаночы дзень, а зараз сьвяткуем перамогу над кулацтвам і спэкуляцыяй.

ДЭЛЕГАТКІ САБРАЛІ 50 ПУДОЎ ПОПЕЛУ.

КАЛІНКАВІЧЫ 11-III. Напярэдадні міжнароднага жаночага дню дэлегаткі гор. Калінкавічы 7-га сакавіка арганізавалі збор попелу. Дэлегаткі з падводай абʼяжджалі гарадзкія дамы і дагаварыліся з насельніцтвам аб тым, каб мачыйся ў яго попел ссыпалі на пад воду. Усяго за адзін дзень сабрана 50 пудоў попелу.

Так калінкавіцкія дэлегаткі адзначылі свае сьвята практычнай дапамогай па ўзьнаўленьні ўраджайнасьці.

ЗА ЗРЫЎ ПАСЕЎКАМПАНІІ—ПАД СУД.

ЖЫТКАВІЧЫ, 11-3. Жыткавіцкім райвыканкомам да гэтага часу яшчэ ніякага практычнага ня зроблена ў справе паскорваньня падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўкампаніі. Так, напрыклад, да пачатку сакавіка месяца па ўсяму раёну насеньне ачышчана толькі пяць процантаў заданьня. А між тым у райёне ёсьць дастатковыя для машын плошчы, якія можна было-б ачышчаць насеньне на сто процантаў заданьня.

Такія вынікі атрымаліся таму, што Жыткавіцкі РВК ясна ня ведае, нават болей таго, праступна адносіцца да гэтае важнае справы.

Атрымаў Жыткавіцкі РВК плян пасеўкампаніі з Мазыру. Перапісаў па-свойму, называецца выпрацаваў плян. Выпрацавалі плян і рэзалюцыю і паклаўшы ў скрыню шафы. Так плян і ляжаў сабе. А сельсаветы чакалі паказаньняў і сельсаветы спадзяваліся на кіраўніцтва.

АКК-РСІ вынырла такую «дзейнасьць» Жыткавіцкіх райвыканкомаўцаў. Пытаньне абгаварвалася на прэзыдыуме АВК і апошні пастанавіў перадаць усю справу ў пракуратуру для аддачы ўсіх вінавых у зрыве пасеўкампаніі па Жыткавіцкаму райёну пад суд.

Арганізавалася малочнае таварыства імя 8-га сакавіка.

КАЛІНКАВІЧЫ, 12-3. У вёсцы Сітня, Калінкавіцкага сельсавету, арганізавалася на днях малочнае таварыства.

У таварыства ўвайшло 35 чалавек, у большасьці жанчыны. Таварыства арганізавалася напярэдадні сьвяткаваньня Міжнароднага Жаночага Дню—таму большасьць прысутных выказалася за тое, каб таварыства насіла імя 8-га сакавіка.

Сітня, у якой арганізавалася малочнае т-ва, зьяўляецца буйнейшай вёскай, заселенай выключна яўрэйскім насельніцтвам. У вёсцы 45 двароў. 85 процантаў усяго складу гаспадарак уваходзіць у малочнае таварыства. І старшынёю таварыства, на першым арганізацыйным сходзе, абрана жанчына.

БУДАЎНІК УЛАСНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Ёсьць у Горках сельска-гаспадарчае прадпрыемнае таварыства, а т-ва мае краму, у якой быў загадчык Пераплётчык. Увесь час на Пераплётчыкам зауважаліся злоўжываньні і агульны сход пайшчыкаў прапанаваў праўленьню зьняць яго з працы.

Пры апошняй рэвізіі знойдзена лішку ў краме на 200 рублёў. Рэвізамісія падкрэсьліла, што гэта вынік неправядзеньня зьніжэньня цэн.

Далей пры зобыску ў Пераплётчыка знойдзена дома шмат збожжа, забранага з каапэрацыі.

Улічыўшы ўсе дзеяньні, праўленьне зьняла Пераплётчыка з працы і прыцягнула да судовай адказнасьці. Здаецца ўсё добра? Але не яшчэ. Якімсьці чынам сьледчыя органы спынілі справу Пераплётчыка і прапанавалі Горацкаму т-ву прыняць яго зноў на працу. Аршанская пракуратура, у чым тут справа?

Мясцовы.

Запазычанасьць па страхавых плацяжох.

Ворша, 11-3. Апошні тэрмін для ўзносаў страхплацяжоў скончыўся яшчэ 10 студзеня, але і на 15 лютага поўнага выкананьня страхоўкі няма. Усяго па акрузе паступіла 75 проц. усіх належачых да паступленьня страхавых плацяжоў. Асабліва адстаюць райёны: Аршанскі, які выканаў узысканьне ўсяго на 62 проц., Крупскі—на 67 проц., Дубровенскі—на 69 проц., Чарэйскі—на 70 проц. і Коханаўскі—на 71 проц. Па некаторых райёнах ёсьць яшчэ выпадкі, калі льготныя фонды яшчэ не разьмеркаваны і да іх разьмеркаваньня толькі прыступлена. У сувязі з гэтым акрыканком даў заданьне райёнам у самы кароткі тэрмін ліквідаваць запазычанасьць па страхплацяжох і разьмеркаваць усе льготныя фонды.

Скончым пабудову дарог.
(Капыльскі м-савет).

Тая сума грошай самаабкладаньня, якая была адпушчана м-саветам на дарожнае будаўніцтва, была недастатковая. У першую чаргу выбрукоўваліся вуліцы, па якіх больш езьдзіць сялянства, а шмат астатніх перавулкаў засталіся яшчэ гразкімі, в калдобінамі.

Але ў гэтым годзе, у надыходзячую вясну, гэтыя гразкія перавулкі і вуліцы будуць выбрукаваны.

2-е самаабкладаньне па ўсяму м-савету прашло поўнасьцю і законна, г. ё. па 25 проц. з рубля.

Ужо пачаўся збор сродкаў і заўважаецца дабраахвотнасьць, не чакаўшы пакуль прыдуць з напамінкамі ад м-с.

А. Странок.

Райённыя зьезды саветаў.

ПОЛАЦАК, 13-3. Акрыканком устанавіў тэрміны скліканьня райённых зьездаў саветаў. 17 сакавіка адбудуцца зьезды Дрысненскага, Валынецкага, Расонскага і Асьвейскага райёнаў, а 24 сакавіка пачнуцца зьезды у Лепельскім, Вульскім, Ветрынскім і Полацкім райёнах. Зараз вядзецца належная патрыхтоўчая работа.

Позьнімся.

Магілеў, 13-3. Ужо падыходзіць час, калі трэба вызначыць, дзе менавіта сёлета пойдзе земляўпарадкаваньне, а справа з арганізацыяй новых калгасаў пасоўваецца марудна. На гэты час створана 34 калгасы, пры арыентыровачным пляне ў 113. Асабліва адстаюць райёны Чачэвіцкі (ня створана ніводнага калгасу), Чырыкаўскі, Касьцюковіцкі, Чырвонапольскі.

66 кваліфікаваных майстроў

Магілеў, 13-III. Скончылі сваю працу ўсебеларускія курсы па сыраварэньню і маслароблству, з якіх выпушчана 66 чалавек. З іх: камандыраваных Магілеўскай акругай—22 чалавекі; усе яны (а роўным чынам тыя 12 чалавек якія праслухалі курсы па маслароблству ў Менску) прызначаны на працу ў малочныя арцелі.

Земляўпарадкаваньне калгасаў.

Мазыр, 9-3. За надыходзячую вясну і лета ў Мазыршчыне маркуецца земляўпарадкаваць 37 новаарганізаваных калгасаў.

Калі лік калгасаў, якія арганізуюцца ў гэтым годзе, перавысіць арыентыровачны плян, дык Акрэа мяркуе для земляўпарадкаваньня калгасаў скарыстаць студэнтаў камэрнацкіх навуковых устаноў, якія прыбудуць на летнюю практыку.

Курсы для жанчын членаў сельсаветаў.

Гомель, 11-3. У райёне акругі ў перыядзе 17-га сакавіка па 1-е красавіка будуць арганізаваны трохдзённыя курсы для жанчын сяброў сельсаветаў.

ПЛЕНУМ ЦСПСБ.
Вынікі калдагаворнай кампаніі.

Пленум ЦСПСБ першым пытаньнем абгаварыў даклад т. Розіна аб выніках калдагаворнай кампаніі ў БССР.

Як мясцовыя, так і генэральныя дагаворы шырока абгаварваліся на масавых рабочых сходах па зьменах і цэхах. Наведваемасьць гэтых сходаў хісталася ад 60 да 100 проц.,—у большасьці выпадкаў, у параўнаньні з леташнім годам, наведваньне сходаў павялічылася. Побач з гэтым павялічылася і досыць значна актыўнасьць асобных груп работнікаў: жанчын, моладзі і інш. У шмат выпадках сходы працягваліся 2-3 дні, і рабочыя ўносілі цэлы шэраг прапаноў для вынішчэньня недахопаў, якія былі ў старых калдагаворах.

Не зважаючы на яснасьць дырэктыў вышэйшых прафсаюзных і гаспадарчых органаў, гэтыя дырэктывы на мясцох у большасьці выпадкаў гаспадарнікамі і ў шмат выпадках прафсаюзнымі арганізацыямі тлумачыліся па рознаму, што прывяло да надзвычайнага павялічэньня спрэчных пытаньняў пры перазаключэньні калдагавораў. Так, па Гомелю летась было 79, а сёлета ўжо 104 канфлікты. Павялічэньне колькасьці канфліктаў назіраецца па Менскай, Віцебскай і Мазырскай акругах. Толькі ў Бабруйску лік апошніх зьменшыўся. Меліся масавыя выпадкі канфліктаваньня гаспадарнікаў па дробных пытаньнях, якія ня маюць ніякага значэньня для вытворчасьці, што выклікала правільныя нараканьні з боку шырокіх рабочых мас.

Урадавай камісіяй пры СНКБ быў устаноўлен фонд падвышэньня зарплаты на 1928-1929 г. у разьмеры 299.000 руб., якія былі разьмяркованы па трэстах і асобных гаспадарчых адзінках. Гэтыя сродкі, галоўным чынам, былі скарыстаны на падцягваньне зарплаты адстаючым групам рабочых, а таксама на правядзеньне тарыфнай рэформы.

У адпаведнасьці з дырэктывамі УсеЦСПС і ВСНГ СССР, у большасьці выпадкаў нормы выпрацоўкі і зьдельныя расцэнкі ў часе перазаключэньня калдагавораў не пераглядаліся.

Прафсаюзам удалося адстаяць на цэламу шэрагу калдагавораў значныя палепшаньні прававых норм: напрыклад—пашырэньня норм спецвопраткі і скарачэньня тэрміну носкі апошняй па некаторых калдагаворах дае дадатковыя водпускі рабочым, якія заняты на шкодных работах. Устаноўлена аплата прастояў па віне адміністрацыі; прадугледжана ў калдагаворах палепшаньне пастаноўкі навучаньня вучняў-пакростаў, пабудова новых школ фабзавуча, арганізацыя вячэрніх прафтэхнічных курсаў для моладзі і шэраг іншых палепшаньняў.

У спрэчках па дакладу выказала 22 чалавекі. Аб чым-жа гаварылі члены пленуму—прадстаўнікі з месц?

Тав. Арабей (Слуцак) указвае, што Акрвыканком ня выплачвае настаўнікам кватэрных грошай, а між тым калдагаворы ёсьць пункт аб выплаце гэтых грошай.

Тав. Левін (саюз друкароў) кажа, што гаспадарнікі з пачатку давалі згоду на тое ці іншае палепшаньне, пры падпісаньні калдагавораў адмаўляліся.

Тав. Берзін (Віцебск) гаворыць, што недахопы леташняй кампаніі не прыняты пад увагу пры правядзеньні сёлетняй: на былі скарыстаны для правядзеньня кампаніі чырвоныя куткі, перапынкі, вечары і г. д. Вынікі калдагаворнай кампаніі ня былі прапрацаваны ўсімі незавымі прафарганізацыямі і на вывучаны памылкі. На наведваньні сходаў рабочымі адбівалася тое, што стары калдагавор не выконваўся.

Тав. Новікаў (Барысаў) указвае, што дагэтуль на «Дембале» рабочыя не атрымалі ніводнай спецвопраткі ніводнага экземпляру калдагавору,—трэба за гэтую цэганіну трэсты прыцягнуць да адказнасьці.

Тав. Шмурыгін (з Бабруйску) гаворыць, што калдагаворы для гаспадарнікаў павінны быць законам, а яны іх ня выконваюць, і прыходзіцца часам справу даводзіць да суда.

Тав. Чаркаскі зазначае, што ў руху слаба высьветлялася калдагаворная кампанія. Былі выпадкі, калі гаспадарнікі спрабавалі пагоршыць становішча рабочых, і прафсаюзы прымушаны былі канфліктаваць. Правільнасьць лініі прафсаюзаў відаць з таго, што 70-80 проц. канфліктаў вырашана на карысьць прафарганізацый. Трэба пэрыядычна правяраць выкананьне калдагавораў.

На барацьбу з разгільдзяйствам, нядбайнасьцю і прагуламі.

Старшыня ВСНГ Бел. тав. **Карп** на пленуме зрабіў даклад аб выкананьні прамфінпляну.

Як і належала чакаць, даклад выклікаў шырокія спрэчкі.

— Пытаньне падняцьця працоўнай дысцыпліны,—кажа т. **Арабей**,—балючае пытаньне. У дзяржаўнай прамысловасьці ўсе вінцікі павінны працаваць без перабою; мы-ж назіраем на прадпрыемствах вялікія прагулы, а гэта адбіваецца на падняцьці вытворчасьці, на зьніжэньні сабекошту прадукцыі. Кожны з нас павінен на месцах навесьці растлумачальную працу аб неабходнасьці падчыняцца працоўнай дысцыпліны.

Некаторыя таварышы ўказвалі, што на прагулах часам адбіваюцца розныя пасяджэньні. Трэба было ў фабкоме разгледзіць плян жыльлёвага будаўніцтва, і з работы здымаецца 9 чал.

— Трэба,—гаворыць т. **Сулькіна**,—прапрацаваць пытаньне, каб пасяджэньні не адбіваліся на падняцьці вытворчасьці.

— У шэйнай прамысловасьці,—кажа яна,—выпрацоўка дасягнула толькі 50 проц. вызначанага плянам. На нармальную выпрацоўку зрабіў уплыў пераход на спецыялізацыю; шмат патрацілі часу, пакуль рабочыя прывыклі да новай вытворчасьці. Пусьцілі цэх па вырабу паліто, а ў нас усё яшчэ ішло абгаварэньне аб фасоне і г. д. Праўда, дзякуючы рацыяналізацыі і спэцыялізацыі, мы зьнізілі кошт прадукцыі.

Тав. Мяцельскі (Гом.) гаворыць, што як толькі пачынаюць на прадпрыемстве пераглядаць расцэнку адказнага рабочага, дык ён становіцца на дыбы і адстайвае свае інтарэсы, а гэта робіць нядобры ўплыў на рабочую масу.

Тав. Берзін прыводзіць прыклад, калі на фабр. «Дзьвіна» ў часе калід ня вышка 400 рабочых, а на «крещение»—180 рабочых, і ня прымаюцца ніякія меры, каб павесьці адпаведную працу сярод рабочых.

— Часам,—кажа ён,—на колькасьці прагулаў адбіваецца і тое, што не прымаюцца меры да ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па ахове працы. Так, на зав. «Чырвоны Металіст» недастаткова вэнтыляцыя, рабочыя падаюць ад чаду.

Тав. Беліна знаходзіць, што на мясцох недастаткова праводзіцца выхаваўчая праца, а таму падае вытворчасьць і дысцыпліна. Дактары часам даюць водпуск здароваму, а гэта адбіваецца на становішчы страхкасы і на вытворчасьці. Кепска ў нас яшчэ тое, што адміністрацыя ня выконвае прапаноў вытворчых нарад, з прычыны чаго ў рабочых няма ахвоты прыходзіць на нарады.

—На фабр. імя Дембаля,—кажа т. **Новікаў**,—вытворчасьць працы значна павысілася, але ёсьць няўвязка па цэхах. Дзякуючы гэтаму і цеснаце, у нас вялікі процант браку і бою.

Дысцыпліна сярод часткі рабочых кульгае і трэба павесьці растлумачальную працу.

— Кепска,—кажа т. Новікаў,—у нас і з скарыстаньнем студэнтаў-стажораў—іх ня ўцягваюць у штодзённую практычную работу прадпрыемства.

Адначалі выступаўшыя таварышы і тое, што неабходна склікаць нарады старых рабочых, каб уцягнуць іх у барацьбу за падняцьце вытворчасьці, за падняцьце працоўнай дысцыпліны сярод новых кадраў рабочых.

Наогул, усе выступаўшыя таварышы прыходзілі да адной думкі, што трэба павесьці самую рашучую барацьбу з разгільдзяйствам, нядбайнасьцю і прагуламі. Трэба шырэй разгарнуць самакрытыку, якая павінна дапамагчы падняць вытворчасьць працы і працоўную дысцыпліну.

Безгаспадарчасьць у Бабруйскім камгасе.
(Ад нашага ўласнага карэспандэнта).

Вы зайдзіце ў Бабруйскі гарадзкі камгас і пазнайдзеся, якою маемасьцю карыстаецца ў даны момант ён і вы не атрымаеце адказу. Камгасаўскае начальства будзе няўпэўнена націскаць плячмі, капацца ў паперках і ў выніку ўсяго скажа:

— А ліха яго ведае, вучоту няма.

І ўзапраўды вучоту маемасьці ў камгасе не існавала і ня існуе цяпер. Камгас толькі ведае, колькі муніцыпалізаваных будынкаў знаходзіцца ў яго распараджэньні, але нават на скажа таго, з якога матар'ялу зроблен той ці іншы дом, не гаворачы ўжо аб яго кубатуры, вялічыні і г. д.

Такое-ж прыблізна становішча можна назіраць з муніцыпалізаванай у свой час мэблі. Вучоту яе няма: невядома адкуль і калі якая маемасьць папала пад распараджэньне Бабруйскага камгасу.

Але гэта ня ўся бяда. Безгаспадарчасьць Бабруйскага камгасу ідзе далёка ўперад.

Кватэрны фонд, які знаходзіцца пад ведамам камгасу, знаходзіцца ў вельмі кепскім становішчы, патрабуе рамонту, а, між тым, кватэрная плата не скарыстоўваецца на рамонт жыльлёвага фонду. На гэтую мэту скарыстоўваецца толькі 39 процантаў кватэрнай платы, што, бязумоўна, недастатковa.

Аб становішчы кватэр і гаварыць страшна. Тут панае паўнейшая безгаспадарчасьць. Памяшканьні ўтрымоўваюцца ў няспраўнасьці, на падлогах колюцца дровы, коміны на працягу цэлага году ня чысьцяцца, кватэры апальваюцца жалезнымі печкамі, частка жылой плошчы зусім не апаліваецца. Адсюль, як вынік—сырасьць, псаваньне сьцевак і г. д.

Асабліва кідаецца ў вочы сваёю безгаспадарчасьцю новае кватэрнае будаўніцтва, пляніроўка кватэр тут рабілася так, што няжылая плошча (калідоры, кухні) у новых дамох даходзіць да 30-35 проц. агульнай плошчы. У гэтых дамох можна знайсьці калідоры шырынёю амаль што каля трох мэтраў, можна знайсьці ў маленькіх пакойчыках па дзьве печкі, і, наадварот, у вялікіх пакоях—на адной печы. Прычым гэтыя печы набудаваны вялізарныя. Яны патрабуюць шмат апалу, што зусім не карысна рабочаму-жыльцу і даюць мала цяпла.

У выніку такога становішча ў новых дамох назіраецца вялікая сырасьць. У пакоях холодна, са столі цячэ, сьцены і столь пакрыты сьнегам і лёдам. У некаторых дамох сырасьць даходзіць да таго, што ў наглядную сьцяну свабодна праходзіць нож.

Вось у такім дзікім кватэрным становішчы прыходзіцца жыць рабочым сем'ям, якімі населены новыя дамы.

Хапае безгаспадарчасьці і ў тым кватэрным фондзе, які нерададзен камгасам у арэнду Жактам. Затраты на рамонт гэтых дамоў вельмі мізэрныя. Капітальнага рамонту дамоў амаль што не вытвараецца і такім чынам жыльлёвы фонд мала на малу нішчыцца. У справе карыстаньня гэтымі дамамі назіраецца ня лепшае становішча, як і з дамамі камгасу.

Вучоту маемасьці і адзінкі яе ня нерадачы Жактам няма ніякога і, такім чынам, нельга судзіць аб тым, наколькі палепшаецца ці пагаршаецца становішча жыльлёвага фонду.

Характэрным зьяўляецца тое, што Бабруйскія ўстановы да апошняга году зусім не планілі арэндай маты за займаемыя памяшканьні.

Што датычыцца муніцыпалізацыі жыльлёвага фонду, то тут трэба сказаць, што яшчэ і да гэтага часу шмат больш буйных прыватных дамоў па галоўных вуліцах зьяўляюцца не мунацыпалізаванымі.

Усё гэта яшчэ больш пагаршае кватэрнае становішча ў Бабруйску. Відаць, што гэтым пытаньнем да гэтага часу сур'ёзна ніхто не займаўся. Ды й як ім было займацца, калі за апошнія тры гады пераміналася 8 загадчыкаў жыльлёвым падгаспадарам, а за апошні год—чатыры. Загадчыкі камгасу за апошнія тры гады мяняліся 5 разоў.

Відома, што пры такім становішчы нельга было чакаць добрай працы камгасу. Адсутнічаньне гаспадарчага вока і зацікаўленасьці ў справе падтрыманьня кватэрнага фонду прывяло яго да сучаснага становішча.

Патрэбны рашучыя меры для зьнішчэньня такога становішча. Вінаватых у агульнай безгаспадарчасьці, а тым болей вінаватых у такім хаатычным будаваньні новых кватэр павінны панесьці кару.

А. Дамброўскі.

Дзеньнік удзельніка галоднага паходу ў Лёндан.

Вялікі паход ангельскіх беспрацоўных у Лёндан скончыўся.—Удзельнікі яго, якія ішлі групамі з розных канцоў краіны, дасягнулі сталіцы.—Як у Лёндане, так і па шляху яны сустракалі гарачае спачуваньне рабочых мас, тупую індыфэрэнтнасьць улады і адкрыты сабатаж з боку прафбюракратаў.

Глазго. Нядзеля 21-га студзеня 1929 г. Прышлі з Лёхгэлі ў Глазго ў 12 гадзін дню. Нас прывялі ў „гасьцініцу", дзе нам далі абед, які складаўся з кашы і бульбы. Потым нас прывялі ў нашыя „спальні". Я ўпяршыню бачу падобную гасьцініцу. Яна нагадвае мне турму, каморы якое абернуты ў пакоі. Адзіная розьніца ў тым, што тут няма жалезных кратаў. Усе спальні аддзяляюцца адна ад другой тоненькай фанэрнай перагародкай. Мы прадэфілявалі на пляц, дзе адбыўся шматлюдны і захапляючы мітынг які цягнуўся больш дзьвюх гадзін. Увечары адбыўся другі мітынг у вялікай гарадзкой залі. На гэтым мітынгзе было мала народу. Справа ў тым што незалежная сацыялістычная партыя наладзіла вечар з музыкай у кіно «Олімпія», недалёка ад нашае залі.

У горадзе, абраўшым мэкстона ў парлямант, як відаць прыкмячаецца некаторая варожасьць да нашага паходу. Мэкстон карыстаецца вялікім посьпехам сярод тутэйшых жанчын. Як толькі хто-небудзь успамінаў яго імя чуліся воплескі. Мне нават паказалася што была спроба сьвядома сарваць наш мітынг. Некаторыя жанчыны ў хустачках крычалі і сьвісталі пры выступленьнях Кейна, таму, што ён адважыўся крытыкаваць Мэкстона. Кейн страціў цярплівасьць і сказаў жанчынам, што ён спадзяецца, што кроў Джыма Каннолі (пакараны сьмерцю правадыр ірляндзкіх рабочых паўстанцаў) калі небудзь задушыць усіх рабочых правадыроў у Англіі.

Я ня мог заснуць аж да раніцы. Устаў зноў у 8 гадзін. На сьняданьне нам далі кашу, яйко з хлебам і гарбатаю.

Гэтая гасьцініца разьлічана на бяздомных. Людзі, атрымліваючыя дапамогу па беспрацоўі, могуць атрымаць тут харчы за 10 шылінгаў (5 руб.) у тыдзень і ложак за 6 шылінгаў—3 рублі ў тыдзень. Пасьля гэтага ім застаецца паўтара рубля ў тыдзень на „роскошь".

Прытулак арміі выратаваньня. Аўторак, 23-га студзеня. Гавінгтон прыехаў сёньня. Было пастаноўлена, што мы выйдзем з Глазго заўтра раніцою ў 10 гадзін. Усе ў зборы—усяго 143 чалавекі. Яны робяць добрае ўражаньне, і, як відаць, цьверда пастановілі падпачальвацца кіраўніцтву кантрольнага савету. Я ваду першую калёну (графства Файф). Я таксама начальнік атраду Чырвонага Крыжу і член кантрольнага савету.

КЭТРЫН. Серада, увечары. Мы прышлі сюды ўвечары ў 6 гадзін. Нам прышлося прайсьці Мохлін, бо нам адмовілі ў памяшканьні. Так сустракае нас царкоўная ўлада. (Адзіныя аграмадныя памяшканьні належаць царкве).

Мы трапілі ў Катрынскі інстытут. Тут утульна, цёпла і добра. Людзі вясёлыя, але вельмі многія намулялі сабе ногі і прымушаны прасіць дапамогі ў Чырвонага Крыжу. У працягу ўсёй дарогі мы рабілі зборы на паход сярод пасажыраў аўтабусаў. Сабрана 15 фунтаў (150 руб.). Надвор'е добрае. Мароз і сонца—усю дарогу.

СТАРЫ КЭМНОК. Пятніца, увечары. Мы прышлі сюды а палове шостай увечары. Надвор'е ўвесь час дасканалае. Хлопцы вясёлыя. Нам прышлося, аднак, выключыць некаторых з іх, як непажаданы элемент, і чаланек двох прышлося адасласць дамоў, бо ў іх вельмі балелі ногі. Як відаць, некаторыя з выключаных расказалі супрацоўніку глазгоўскае рабочае газэты, што ўдзельнікі паходу не атрымліваюць харчоў і што да іх вельмі дрэнна адносяцца. Зразумела, гэта—агідная мана. Арганізатары паходу клапоцяцца аб харчох для ўдзельнікаў, а амаль ва ўсіх гарадох рабочыя арганізуюць нам абеды і вячэры. У сучасны момант адпачываючыя людзі наладзілі канцэрт і сьпяваюць.

Тут нарадзіўся Кей-Гардзі (заснавальнік незалежнае рабочае партыі). У гэтым горадзе гарадзкі галава—член рабочае партыі,—аднак, ён ня толькі ня сустрэў нас, але пашоў гуляць у карты сёньня ўвечары. Ні адзін правадыр рабочае партыі не сустракае нас.

Мы спрабавалі наладзіць збор у кіно, але дырэктар заявіў нам, паколькі генэральная рада прафсаюзаў не падтрымлівае паходу, ён ня можа дазволіць збору.

Мы атрымліваем усю патрэбную дапамогу ад рабочых і можам пляваць на прафсаюзных правадыроў.

Мы палуднавалі ў гарняцкім пасёлку, дзе нас дасканала сустрэлі.

НОВЫ КЭМНОК. Субота, 26-га студзеня. Тут у нас ня было памяшканьня. Мы спрабавалі ўвайсьці ў кантакт з «рабочымі» мэрам. Пасьля доўгіх шуканьняў мы знайшлі яго, і ён заявіў нам, што рада пастанавіла не даваць нам гарадзкога памяшканьня. У той час, як мы вялі перамовы, удзельнікі паходу сталі на вуліцы і сьпявалі рэвалюцыйныя песьні. Таварыш Гавінгтон даў зразумець меру, што калі ён ня ўступіць, дык яны могуць перайсьці ад песьняў да справы. Лішне казаць, што мы атрымалі памяшканьне.

Па дарозе нам паведамілі, што мясцовыя гарнякі назапасілі для нас паўтараста пірагоў, кілё аўсянае крупы, 36 фунтаў банак кансэрваў, паўтара кілё цукру, фунт гарбаты. Старшыня рабочага каапэратыву даў нам скрынку памаранцаў, а сам каапэратыў ахвяраваў дзесяць тузін булак. Жаночая сэкцыя рабочае партыі з'арганізавала памяшканьне, зварыла палудзень і абслугоўвала ўсіх нас. Што засталося ад інструкцый генэральнае рады?

Людзі ў добрым стане. Быў доктар, які толькі 3-х накіраваў дамоў з хворымі нагамі.

ТАРНХІЛЬ. Нядзеля 27-га студзеня. Прышлі сюды ўвечары а палове шостай, ішлі пятнаццаць міль. Дарога была цяжкая, бо ў

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ У ПАХОДЗЕ ЗА ЎРАДЖАЙ.

У МАЗЫРШЧЫНУ І СЛУЧЧЫНУ ВЫЕХАЛА ПАХОДНАЯ РЭДАКЦЫЯ І ДРУКАРНЯ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ НА МЯСЦОХ АГЛЯДУ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ. КОЖНЫ БЯДНЯК, СЕРАДНЯК, ЧЛЕН ПАРТЫІ І КАМСАМОЛЕЦ, КОЖНЫ АГРАНОМ, СЕЛЬСАВЕТЧЫК, НАСТАЎНІК, КААПЭРАТАР, КОЖНЫ ВЯСКОВЫ САВЕЦКІ АКТЫВІСТ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У АГЛЯДЗЕ.

Рэдакцыя «Савецкай Беларусі» паставіла перад сабою мэту правесьці грамадзка-вытворчы агляд нематорых раёнаў БССР у справе падрыхтоўкі іх да веснавой пасеўнай кампаніі, выявіць недахваты ў падрыхтоўчай працы, дапамагчы партыйным і савецкім органам у практычнай працы сярод насельніцтва, мабілізаваць на месцы савецкую грамадзкасьць вакол пасяўной кампаніі і падняцьця ўраджайнасьці.

Рэдакцыя ў Мазырскую акругу выслала брыгаду супрацоўнікаў з друкарняй для выпуску на месцы абгляду газэты. Брыгада пасьля заканчэньня працы ў Мазыршчыне выедзе ў Случчыну для такой-жа працы. Брыгада ў сваім распараджэньні будзе мець кіно-перасоўну і радыё-ўстаноўку для культурнага абслугоўваньня сялянства.

Пасьпяховасьць працы брыгады ў значнай меры будзе залежыць ад дапамогі і актыўнага ўдзелу ў ёй селькораў, настаўнікаў, аграномаў і наогул усяе савецкае грамадзкасьці.

Рэдакцыя спадзяецца, што брыгада сустрэне ўсямернае падтрыманьне з боку ўсіх мясцовых органаў і арганізацый у справе правядзеньня керапрыёмстваў, якія накіраваны на падняцьце актыўнасьці сялянства на падняцьце ўраджайнасьці, на пашырэньне плошчы пасеву, на сацыялістычную перабудову вёскі.

Як Гомельшчына рыхтуецца да сяўбы.

(Гутарка з сэкратаром ЦВК БССР т. А. І. Хацкевічам).

— Я выяжджаў у Гомельшчыну для праверкі падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі. За час, які быў у гэтай акрузе, мне давялося па бываць у шэрагу раёнаў і вёсак.

Трэба зазначыць, што сёлетняя падрыхтоўка да вясеньняй пасяўной кампаніі непарыўна зьвязана з ажыцьцяўленьнем цэлага шэрагу мерапрыёмстваў партыі і ўраду на падняцьцю ўраджайнасьці. Гэта задача ў Гомельшчыне ўсвоена на толькі партыйнымі савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі, але і самім працоўным насельніцтвам.

У раёнах і вёсках можна бачыць цэлыя фабрыкі па ачыстцы насеньня, досыць шырока разгарнулася праца па багатоўцы насеньня, сялянства сьпяшаецца набываць апошнае для сяўбы, набывае сельска-гаспадарчыя машыны ўгнаеньне і іншыя прадметы вытворчасьці сельскай гаспадаркі.

Як-жа ідзе падрыхтоўка да пасяўной кампаніі ў Гомельшчыне?

Рознага насеньня на акрузе да 10 сакавіка загатоўлена 108.268 пудоў, што складае 92,6 проц. плянавага заданьня. Мае быць загатоўлена яшчэ 81.600 пудоў. Калі і гэта насеньне паступіць, дык плян па загатоўцы насеньня будзе выкананы на 111 процантаў.

З асобных культур загатоўлена: капюшыны—2.654 пуд., або 88,4 проц. пляну; вікі—17.668 пуд. — 80.7 процантаў; лубіну—60,2 процантаў; яўса «салаты дождж»—108,8 проц. простага і палепшанага—79,6 проц., ячменю—159,2 проц. ільну-даўгунцу—110,2 проц, і ільну мясцовага—143,7 проц. плянавага заданьня.

Залукі райёнаў на авёс, ячмень, вікі і лён-даўгунец перавышаюць плянавыя лічбы, але калі будзе загатоўлена ўсё тое, што намечана, дык насельніцтва насеньнем будзе забясьпечана поўнасьцю.

Сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі акруга забясьпечана, ня ганае толькі трыераў. Не хапае таксама трактараў, малочнага і садова-гароднага інвэнтару, якога Белсельсаюз да гэтага часу не даставіў.

Паводле пляну, меркавался арганізаваць 12 майстэрняў для рамонту сел.-гаспадарчага інвэнтару, арганізавана 10, з іх—4 ужо працуюць, 2 знаходзяцца ў стадыі абсталяваньня.

Да перавыбараў сельсаветаў ачыстка насеньня праходзіла слаба, але пасьля сканчэньня перавыбарчай кампаніі гэта праца разгарнулася і ідзе поўным тэмпам. Так, да 10 сакавіка па акрузе ачышчана 300.000 пудоў насеньня. У акрузе працуе каля 500 машын па ачыстцы насеньня.

Заданьне Сэвнаркому Беларусі ачысьціць 50 проц. пасеўнага матар'ялу ўжо поўнасьцю выканана. Акруга-ж у свой плян уключыла ачысьціць 90 проц. пасеўнага матар'ялу і думае з гэтым справіцца.

Слаба зьбіраецца поплен—сабрана пакуль што 20 тысяч пуд.; лубіну загатоўлена 10 тыс. пуд. і загатоўка яго працягваецца, але плян пашэўна поўнасьцю ня будзе выкананы. Штучнага ўгнаеньня дастаўлена 27 вагонаў, што складае каля паловы плянавых меркаваньняў.

Ідзе праца і па арганізацыі вытворчай кааперацыі—ужо арганізавана 135 аб'яднаньняў. Горш справа з арганізацыяй калгасаў: нелася на ўвазе арганізаваць 60, а пакуль што арганізавана толькі 19.

Праведзена ў акрузе таксама вялікая праца ў галіне агрыкультурнай дапамогі насельніцтву: па акрузе праведзена 48 сел.-гас. курсаў, арганізавана 150 с.-г. гурткоў, з якіх большасьць працуе здавальняюча.

Плян пасеўнае кампаніі пранрацоўваўся амаль па ўсіх арганізацыях. У раёнах—на пленумах райкомаў партыі, райвыканкомаў, на нарадах настаўнікаў, з актывам камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, груп бедноты і г. д.

Кепска ідзе падрыхтоўка да кантрактацыі, бо ўжо тры разы мяняюць плошчу пад бульбу і ячмень. Слаба стаіць справа з быкамі-вытворнікамі—іх не хапае, але да набыцьця іх прымаюцца належныя меры.

Для поўнага ажыцьцяўленьня пляну пасеўнае кампаніі необходна Белсельсаюзу накланяціцца хутчэй высласць у Гомельшчыну малочны інвэнтар, трактары, трыеры і садова-гародны інвэнтар. Няма яшчэ ў акрузе лічбаў, парадку і сродкаў на кантрактацыю лубіну, капюшыны і канаплі. Калі Гомельшчыне трэба весьці кантрактацыю па гэтых культурах, дык Наркамзаёму і іншым адпаведным цэнтральным установам трэба хутчэй даць указаньні і сродкі на месцы, бо інакш будзе позна.

Крэдытны плян быў складзен у сумме 1200000 руб., да 10 сакавіка разьмяркована па крэдытных таварыствах 610000 руб. і будзе яшчэ разьмяркована 150000 руб. Наогул, крэдытаў для пасеўнае кампаніі адпушчана 750000 руб., і трэба сказаць, што іх ня хопіць па рагатую жывёлу

Пытаньне аб вапняках вывучана у трох мясцох. Вапнякі прыгодны для вапнаваньня глебы, але патрэбны спэцыяльныя млыны для іх размолу. Па лініі органаў ВСНГ прымаюцца меры для арганізацыі млыноў на Дабрускай і Нова-Беліцкай фабрыках. Гэтыя млыны необходна арганізаваць тым больш, што ў адным толькі Добрушы ёсьць больш 6 міліёнаў пудоў вапняку.

У заключэньне трэба сказаць, што пры дапамозе цэнтральных органаў і пры далейшай напружанай працы работнікаў Гомельшчыны, вясеньняя пасеўная кампанія ў гэтай акрузе навіна будзе прайсьці з посьпехам.

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЯ НА 1-III—1929 г.

АКРУГА	Працав. у справ. пэрыяд: Стацыянарн. пункт	Перас. абозаў	Усяго машын	Плянав. заданьне у тонах	Ачышчана зерна тон	Выкан. пляну у процант. (зерна).
Віцебская	98	39	301	9000	2354,7	26
Полацкая	17	57	190	10000	1511	15
Гомельская	74	73	338	15000	3666,7	24
Менская	47	168	328	18000	5357,8	30
Бабруйская	39	97	250	18000	5353,7	30
Мазырская	33	82	231	6000	1165	19
Магілеўская	47	93	344	16000	4940	31
Аршанская	71	117	382	15000	4123	27
Па БССР	426	726	2364	107000	28472	26,6

Народны Камісарыят Земляробства БССР.

Бабруйскі камсамол дае прыклад.

(Ліст з Бабруйску).

Нядаўна мы гаварылі аб тым, што бабруйская камсамолія выступіла ў паход за ўраджай.

З таго часу небагата вады ўцякло і камсамол Бабруйшчыны ўжо даў некаторыя практычныя і карысныя вынікі сваёй работы.

КАМСАМОЛЬЦЫ—ЗАСТРЭЛЬШЧЫКІ БАРАЦЬБЫ ЗА ЎРАДЖАЙ.

Мы маем права назваць так камсамольцаў, бо Нарыцкая камсамолія першая ўзялася за збор попелу. І вось вынікі: Казловіцкая камсамольская ячэйка сабрала 3 тыс. пуд. попелу, Чыркавіцкая—2500 пуд., Кастрыцка-Слабодзкая—1000 пуд. і г. д. Жыліцкая камсамолія (Бабр. раён) зьявілася арганізатарам зеляпупарадкаваньня і калектывізацыі. Ужо камсамольцы падрыхтавалі глебу для арганізацыі 2 калгасаў. У сваю чаргу камсамольцы Старобінскага раёну арганізавалі 2 машынныя таварыствы і вядуць працу па падрыхтоўцы да вясны.

Хіба ня відаць вялізарная арганізацыйная воля Чапілёўскай ячэйкі, Старобінскага раёну. Сваю работу камсамольцы тут накіравалі на тое, каб з'агітаваць бацькоў на скваронье калектыву. І яны свайго дабіліся. Калгас ужо арганізаваны.

ІНІЦЫЯТЫВА КАМСАМОЛУ ЗАХАПЛЯЕ СЯЛЯНСТВА.

У працы камсамолу па барацьбе за ўраджай сялянства бачыць сур'ёзную работу і ідзе за камсамолам. Па Старобінскаму раёну, напрыклад, камсамольцы вызначаюцца адказныя кіраўнікамі вернаачышчальнай працы. Тут да кожных 10 двароў прымацаван камсамолец, які вядзе і арганізацыю і вучэт вернаачышчальнай працы. І вынікі такога мерапрыёмства добрыя.

На камсамольскаму пачыну пайшлі і служачыя станцыі Несята, Клічаўскага раёну. Яны арганізавалі нядзельнік, адчынілі сродкі і за гэтыя сродкі здабылі для вакольных сялян розныя сельска-гаспадарчыя машыны.

І у справе кантрактацыі пасеваў камсамольцы прымаюць на сябе абавязкі быць начальнікамі справы і цягнуць за сабою сялянства. Па Рагачэўскаму, напрыклад, раёну камсамольцы паставілі сваёю задачаю 15 проц. пляну кантрактацыі пасеваў выканаць «сваімі сіламі і сродкамі».

КАМСАМОЛЬЦЫ ДАПАМАГАЮЦЬ БЕДНАЦЕ.

Аб гэтай дапамозе ёсьць зьвесткі з Чырвонаслабодзкага раёну, дзе камсамольцы арганізавалі 12 дружын для дапамогі бяднацкім гаспадаркам. І горад Бабруйск у гэтай рабоце не адстаў. 10 сакавіка дружыны камсамольцаў-спэцыялістых выступілі ў вёску для правядзеньня пачынаючых работ па наладжваньню сельска-гаспадарчых прыладаў у бяднацкіх гаспадарках.

Такія-ж дружыны арганізоўваюцца і ў іншых раёнах.

У шмат якіх раёнах арганізуюцца конкурсы на лепшую ячэйку па правядзеньню конкурсу на лепшае правядзеньне паходу за ўраджай.

Трэба прызнаць, што першыя вынікі камсамольскага паходу на Бабруйшчыне добрыя. Шырокая сакадзейнасьць вязок, якая разгарнулася ў сувязі з паходам за ўраджай, дае права заявіць, што паход прынясе вялізарную карысьць сельскай гаспадарцы Бабруйшчыны.

А. Дамброўскі.

ПАДРЫХТОЎКА НАСЕНЬНЯ ПАЧАЛАСЯ.

(В. Баршчоўка, Гом. акругі і раёну).

Трыер, сарыроўка і іншыя с.-г. машыны ў нашым крэдытным таварыстве ўжо атрымаліся.

Распачалася перагонка праз трыер грэчкі і інш., але трэба адзначыць, што свайго насеньня сялянне вязуць мала. Тут галоўная прычына ў тым, што райён наш не здабытковы, а спажывецкі.

Але як-ні-як, а прымаюцца спосабы, каб увясну засявалася толькі чыстае насеньне. Сельска-гаспадарчае таварыства клапоціцца дадаткова атрымаць семянны матар'ял.

М. Альбіцкі.

ТРЫЕР ЗА ПРАЦАЙ



(В. Баршчоўка, Гомельскага раёну).

Пасеем ачышчаным насеньнем.

(Чавускі раён, Магілеўшчына).

У мінулыя гады беднота Благавіцкага сельсавета заўсёды сеяла неачышчаным зярном, дзякуючы таму, што у бедноты свайго насеньня ня было, а на пасеў насеньня беднота брала заўсёды ў камітэце ўзаемадапамогі.

Насеньне ў БСУ было заўсёды не ачышчанае, з розным сьмецьцем і пустазельлем, ад чаго з году ў год беднота засявала свае вузенькія палоскі неачышчаным зярном.

Як пасеяць наша беднота неачышчаным зярном свае палоскі, і тады і вырасьце—ня то жаць, ня то касіць, адна трава ды дзе ні дзе стаіць нікалькі каліў збожжа.

Але-ж Благавіцкі БСТУ дадумаўся ачысьціць усё тое насеньне, якое будзе раздана беднаце для пасеву ў сёлетнім годзе. Хоць насеньня ў камітэце і надта мала, але-ж яно будзе чыстае усяго БСТУ ачысьціў 150 пудоў аўса, 12 пудоў ячменя і пудоў ільнянага насеньня.

У сёлетнім годзе Благавіцкая беднота будзе сеяць ачышчаным зярном свае палоскі, што дасьць магчымасьць беднаце ўзьняць ураджайнасьць сваіх палёў на 5 проц., а то і больш.

Чамаданаў В. М.

Дамо Віцебшчыне бульбу на насеньне.

Магілеў. На долю Магілеўшчыны прыпадае нарыхтаваць 30 тыс. пудоў бульбы на насеньне для Віцебшчыны, дзе шмат бульбы летась прапала з-за няспрыяючага надзор'я. Крэдытныя таварыствы пачалі закупку бульбы, якая вясною будзе падвезена да чыгункі. Для расплаты з сялянамі таварыствы маюць 15.000 рублёў.

Школа ў паходзе за ўраджай.

Працуем усім калектывам

(Дамнавіцкая 4-хкамплектная школа, Налібаніцкага р., Мазыршчына).

Школьная рада і самакіраваньне Дамнавіцкай 4-хкамплектнай школы яшчэ в пачатку навучальнага году вызначылі наступныя мерапрыёмствы дзеля палепшаньня сельскай гаспадаркі: 1) зьбіраньне вучнямі попелу, выпіска лепшых сартоў гароднины, выпіска вучнямі газэты «Беларуская Вёска» дзеля растлумачэньня бацькам артыкулаў аб падвышэньні ўраджайнасьці, арганізацыя пры школе садовага пітомніку і ўцяпленьне хлявоў.

Праца пачалася з арганізацыі пітомніка. Вучні заделіся мэтай сабраць на магчымасьці больш дзічак і перанесьці ў школьны пітомнік. Увосень засаджана было больш 80-ці штук. З наступленьнем вясны школа адновіць гэту працу.

Адначасова быў абвешчан збор попелу. уцяпленьне хлявоў і выпіска газэты «Беларуская Вёска».

З 1-га лютага распачата падпіска сярод вучняў на розныя віды гароднага насеньня. На 20-е лютага на рознае насеньне падпісалася 32 вучні на 10 р. 86 к.

На прыблізнаму падліку вучкому на 1-га лютага вучні сабралі каля 150 пудоў попелу. Да вясеньняй сяўбы будзе на менш 200 пуд.

Цяпер школа рыхтуецца да вясеньняй працы на школьным гародзе. Вучні 4-ай групы ўзялі на сябе абавязак зрабіць 10 грабель, 6 насілак, 10 ручак да рыдлёвак і інш. К. Ц.

У такт з жыцьцём.

(Сьмілавіцкі р., Менскай акругі).

На тэрыторыі Сьмілавіцкага раёну ёсьць 52 школы, з іх тры сямігодкі. У карыстаньні школ раёну каля 35 гэкт. пахаці, 11 гэкт. сенажаці, 6 гэкт. саду, 1 гэкт. гароду і звыш 4 гэкт. парку з хмызьняком.

Ня ўсе школы маюць зямельныя надзелы. 14 школ вандруюць па наёмных памяшканьнях, а значыцца ня маюць нават двара. 5 школ хоць і маюць уласныя будынкі, але без зямельных надзелаў (на вясковым выгане).

Толькі 33 школы маюць замацаваныя надзелы, з якіх зусім земляўпарадкаваных можна лічыць 20, а 13 школ хоць і забясьпечаны надзеламі, але надзелы гэтыя знаходзяцца ня пры школах, а на адлегласьці, у вясковай прасналосіцы. Карысьці ад гэтых надзелаў, апрача 10—12 р. гадавой арэнды за гэктар, школы ня маюць, і скарыстаць іх як належыць ніводная школа ня бралася.

З навучальнай мэтай зямельныя вучасткі выкарысталі у 1928 годзе 13 школ, якія маюць зямлю блізка. Тут рабіліся досьледы і набываліся навыкі правільнага догляду гароду, саду і поля. Напр. Пярэмырская школа заняла васьмімольны севазварот (бульба, віка, буракі, авёс, лубін і інш.). Былі закладзены вопытныя градкі на камбінаваных мінеральных угнаеньнях пад гародныя культуры; закладзен плодовы сеянец і зроблена прывіўка дзічкоў. Лешніцкая школа засявала і папулярызавала карнавыя буракі. Логаваслабодзкая школа рабіла досьледы ўплыву гною, попелу, мінеральных угнаеньняў на кораньплоды і пасеўныя травы. Вубельская школа рабіла досьледы ўплыву попелу на капусту і буракі, а таксама сіламі школы аглядала сад. У Турэцкай школе закладзена школка садовых і лясных дрэў. Апчацкая школа практыкавала пчалярства. Аналёгічная дзейнасьць школ Дукарчанскай, Хазянінскай, Голацкай, Анятоўскай, Лядзенскай, Зазерскай і Дукорскай сямігодкі.

Гэтыя-ж школы далі і самы большы прыбытак, які па ўсім раёне складае 758 р. 35 к. Сродкі гэтыя пашлі ў карысьць гэтых школ на дробны рамонт, на агароджу і інш.

Абгароджана покуль што толькі 7 школьных вучасткаў.

Вынікі навучальнай працы школьных вучасткаў наступныя: у вёсны Лешніцы пашырыўся засеў карнавых буракоў; у Голацку пад уплывам школы сялянне сталі сеяць буракі і трускаўку; у Апчацкай ваколіцы сялянне заняві рамавыя вульлі; экземпляры с.-гаспадарчі Пярэмырскай і Лядзенскай школ былі на райённай выстаўцы ў дзень ураджаю; Лядзенская школа атрымала премію: 10 садовых прышчэпаў.

Выдлоўскі.

Голай агітацыяй справы не палепшыш.

(Веткаўскі раён, Гомельшчына).

На насяленьні Рэчкаўскага райкалектыву працаўнікоў асьветы 17-га лютага г. г., на якім прысутнічала 16 настаўнікаў, мы разглядалі пытаньне аб тым, які ўдзел нам трэба прыняць у кампаніі на падняцьцю ўраджайнасьці. Як мы ні біліся, як ні раіліся але вышла, што мы можам толькі агітаваць сялян, раіць ім і мінеральныя угнаеньні, і сеяньне лубіну, капюшыны, кораньплодаў і ўсяго іншага. Самі-ж паказаць на сваіх школьных вучастках мы пакуль што ня можам па наступных прычынах: 1) Вельмі часта нашы школьныя вучасткі знаходзяцца далёка ад школы і не агароджаны; 2) настаўнікаў часта перакідаюць з аднаго месца ў другое, і ён ня мае магчымасьці ўзяцца за школьны вучастак па ўсіх правілах; 3) калі бяруцца за зямлю, дык трэба мець необходныя прылады працы—плуг, барану, каня, карову, угнаеньне і г. д., гэта значыць завесьці цэлую гаспадарку; 4) школьнай зямлі ўлетку няма каму даглядаць, бо настаўнік бывае на курсах і г. д.; 5) у настаўнікаў часта не хапае ведаў аб вядзеньні гаспадаркі, а яшчэ і паказальнага вучастку, бо ў нас-жа ёсьць настаўнікі—дзеці рабочых в гораду, якія саўсім нічога не разумеюць аб вядзеньні гаспадаркі. Вось галоўныя прычыны адсутнасьці паказальных вучасткаў пры школах.

Вядомая рэч, што паказальныя вучасткі пры школах—вельмі добрая рэч, але на жаль, мы іх ня маем і ня можам на практыцы вучыць сялян весьці гаспадарку па-новаму. Мы можам толькі агітаваць, але наш селянін пакуль ня ўбачыць на факце, што ў нас расьце лепшае збожжа і ўсё іншае, не паверыць нашай агітацыі, і ад нашай агітацыі будзе малая карысьць.

Нашы школьныя вучасткі часьцей усяго здаюцца ў аренду, ды бывае, што і кулакам на кабальных варунках, і карысьці ад гэтых вучасткаў няма ніякай. А то бываюць і такія выпадкі, што школьныя вучасткі саўсім не выкарыстоўваюцца.

Настаўнік С. К. Парфіяновіч.

АД РЭДАКЦЫІ: Вышэйпададзены допіс зьяўляецца вельмі характэрным абразцом песымізму часткі нашага настаўніцтва. Як вядома, улада і кіруючыя органы нар. асьветы робяць належныя захады, каб адхіліць усе перашкоды да наладжаньня паказальна-дасьледчай працы на школьнай зямлі.

АЛЕСЬ АДАМОВІЧ.

ПРЫЧЫНЫ ЗРЫВУ ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЯ.

Як гэта ні сумна, але сёньня мы маем поўнае права гаварыць аб зрыве прасьцейшага масавага агратэхнічнага мерапрыёмства—аб зрыве зернаачышчэньня.

Гісторыя з пытаньнем арганізацыі і выкананьня пляну зернаачышчэньня сёлета навучальна для многіх. Наркамзем, акрземаддзелы, уся агранамічная сетка, працаўнікі савгасаў і калгасаў, прафсаюзы (асабліва асьветы і працземлесу), камсамол, партарганізацыі ў вёсцы, райвыканкомы і сельсаветы,—усе абавязаны зрабіць вывады з сёлетняга вопыту. Вывады важны ня толькі для пасьпяховага ажыцьцяўленьня дырэктыў ураду аб «увядзеньні ня больш, чымся ў трохгадовы тэрмін усюды абавязковае ачысткі і сартыроўкі насеньня». Вывады неабходны для больш пасьпяховага правядзеньня ў жыцьцё ўсяго комплексу прасьцейшых агранамічных мерапрыёмстваў, які трэба ажыцьцёвіць абавязкова мільёнам сялянскіх гаспадарак.

Ачыстку і сартыроўку насеньня ў гэтым выпадку найбольш лёгка ажыцьцёвіць. Ход зернаачышчэньня, яго вынікі павінны паказаць, наколькі ўвесь савецкі апарат, зьверху да нізу, наколькі савецкая грамадзкасьць у вёсцы, наколькі партарганізацыі і камсамол гатовы да практычнага выкананьня таго вялізарнага пляну перабудовы сельскае гаспадаркі, які намечан у шэрагу партыйных і ўрадавых пастаноў.

45 проц. падвышэньня ўраджайнасьці ў пяцігодзьдзе—задача нажлівая да выкананьня і рэальная. Але ажыцьцяўленьне гэтай задачы ў першую чаргу абавязковаю ўмовою ставіць уменьне і жаданьне.

Бяднацка-серадняцкія масы вёскі зусім гатовы, каб практычна, пры належным кіраўніцтве, павялічваць ураджайнасьць, перабудоўваць гаспадарку на новых сацыялістычных пачатках. Савецкі апарат, савецкая грамадзкасьць у вёсцы, на вялікі жаль, ня зусім гатовы.

На пытаньні аб зернаачышчэньні дырэктыў было многа і ўсе яны былі своечасовы.

Каму толькі невядома, што Наркамзем даў яшчэ ў кастрычніку 1928 г. указаньне, каб пачаць зернаачышчэньне з лістапада 1928 году і ачысьціць 50 проц. пасеўнага матар'ялу? Гэта зазначэньне знайшло аўтарытэтнае пацьвярджэньне ў пастанове СНК аб вясеньняй пасеўнай кампаніі 12 сьнежня 1928 году. Пляны, абежнікі, пастановы—усё гэта было, прычым у форме зразумелай і катэгарычнай. Праверка выкананьня таксама была. На падставе яе была паслана старшынёю СНК т. Галадзедам 11 студзеня 1929 г. тэлеграма ўсім акрвыканкомам і райвыканкомам.

«Катэгарычна прапануецца прыняць рашучыя захады да максымальнага разгортваньня працы ў бліжэйшы час, арганізаваўшы сталае кіраўніцтва і контроль за выкананьнем заданьня ачысткі збожжа. Вінаватых у зрыве працы па ачыстцы збожжа прыцягнуць да адказнасьці»—вось дырэктыва старшыні СНК. Паўторная праверка паказала, што і гэта дырэктыва не памагла. Ня толькі ніхто ня быў прыцягнут да адказнасьці—у шэрагу райвыканкомаў тэлеграма была падшыта да справы і толькі.

Ліст ЦК КП(б)Б за 25 студзеня аб пасеўнай кампаніі завастрыў усе пытаньні, якія необходна вырашыць. Аднак і пасьля лісту справа мала пасунулася наперад.

Друк на працягу пяці месяцаў ня толькі сыгналізаваў, але і выявіў тысячы абуральных фактаў бязьдзейнічаньня апарату, адсутнасьці пляноў, нескарыстаньня машын, бязьдзейнічаньня партыйных і камсамольскіх арганізацый і г. д. Ці адзін, аднак, «каркрэтны насіцель зла» ня толькі не атрымаў належнага ўзысканьня, а нават не пакланяціўся даць куды трэба тлумачэньні, чаму ў тым ці іншым раёне, сельсавеце, савгасе, калгасе бязьдзейнічаюць машыны, чаму правальваецца зернаачышчэньне. Газэты: „Савецкая Беларусь“, «Зьвязда», «Беларуская Вёска» пасьля зьмяшчэньня карэспандэнцый аб злачынным бязьдзейнічаньні ў вёсцы пасылалі ў Акрвы і райёны спэцыяльныя запытаньні, і ніхто амаль ня даў яснага і дакладнага тлумачэньня прычын. А калі і былі адказы на тую ці іншую карэспандэнцыю, дык у аснове іх ляжаў казённы дабрабыт, а часамі і «ўціраньне ачкоў».

Факты па Грэскаму раёну, Менскай акругі, і Чачэрскаму раёну, Гомельскай акругі, калі ў раёне ня было ачышчана ніводнага пуда зярна, а ў райвыканкомаў хапала адвагі гаварыць аб ачышчэньні тысяч пудоў—што можа быць красамоўней?!

Становішча з зернаачышчэньнем на 1 сакавіка характарызуюць наступныя даныя. Необходна да вясеньняй пасеўкампаніі ачысьціць 107.000 тон насеньня, ці 6.527.000 пудоў. Гэта без савгасаў і калгасаў, дзе пасеўны матар'ял павінен быць ачышчан на 100 проц.

Ачышчана на 1 сакавіка 28.472 тоны, ці 1.736.792 пуды, што складае 26,6 проц. заданьня. Вось асноўныя вынікі працы за 4 месяцы з пачатку кампаніі. Вынік нікуды ня годны, калі ўзяць пад увагу згрупаванасьць сіл і сродкаў усёй краіны на пытаньнях узьняцьця ўраджайнасьці. Дзе прычыны такога нізкага эфэкту ад мерапрыёмства, якое цалкам у нашых руках, і на якое мы больш усяго можам уплываць. Водлуг думкі райвыканкомаў і некаторых Акрва, прычыны ляжаць у наступным:

а) кансэрватыўнасьць насельніцтва, якое прызвычаена чысьціць зярно непасрэдна перад сяўбой;

б) позьняй малацьбой яравых сёлета ў сувязі з сырою восенью;

в) позьнім завозам неаналабытых зернаачышчальных машын;

г) моцнымі маразамі ў студзені і лютым;

д) адсутнасьцю ў мясцовым бюджэце сродкаў на наём загадчыкаў перасовачнымі абозамі;

е) прызвычаеньнем сялянства ў некаторых акругах (Гомельскай, Бабруйскай) хаваць зярно ў спэцыяльна зарытаваных ямах у зямлі;

ж) кампанія перавыбараў сельсаветаў перашкодзіла згрупаваць увагу мясцовых арганізацый на пытаньнях ураджайнасьці і пасеўкампаніі.

Большасьць з гэтых прычын ня могуць лічыцца важнымі, а ссылкі на некаторыя—нават недапушчальны і палітычна няправільныя.

Кансэрватыўнасьць у насельніцтва ёсьць, але мы-ж закліканы гэту кансэрватыўнасьць магчыма хутчэй зьнішчыць. Трэба дабіцца праз тры гады стопроцантнае ачысткі пасеўнага матар'ялу, трэба «забясьпечыць поўнае скарыстаньне збожжаачышчальных машын і трыераў на працягу ўсяго году». Баручы ў аснову «кансэрватыўнасьць», калі-ж загадаецца рабіць пералом у сялянстве? Можа ў канцы пяцігодкі, калі будзе відаць, што з-за нашага бязьдзейнічаньня ўраджай не падвышаецца! А потым вельмі раім любіцелям пагаварыць аб „кансэрватыўнасьці“ пачытаць прыгаворы сотняў вёсак аб ачыстцы зярна на 100 проц.

Позьняя малацьба сялянамі таксама ня можа зьяўляцца прычынаю, бо асноўная маса сялян абмалаціла своечасова. Спазьнілася з малацьбою асобныя хутарскія, кулацкія гаспадаркі, але і то не таму, што была сырая восень. Факт позьняга завозу зернаачышчальных машын сёлета ёсьць, але дарэчы тут-жа паставіць пытаньне,—а што рабілі ўсе гэтыя 4 месяцы 1721 машына, якія засталіся ад мінулага году?

Паважнымі прычынамі трэба лічыць вялікія мразы ў гэтую зіму і хаванне зярна ў ямах. Але маразы (такія, якія не даюць магчымасьці працаваць) былі толькі ў асобныя дні, а насьпенне ў зямлі хавае вельмі значнае колькасьць сялян.

Недарэчнымі і глыбока няправільнымі трэба лічыць разнову, што ў мясцовым бюджэце няма сродкаў на наём загадчыкаў перасовачнымі абозамі, і што зернаачышчэньню перашкодзіла кампанія перавыбараў саветаў. Аб няправільнасьці апошняга тлумачэньня падрабязна гаварыцца ў лісьце ЦК КП(б)Б аб пасеўнай кампаніі.

Фактычныя прычыны зрыву зернаачышчэньня сёлета, бязумоўна, каранцца ў наступным:

Падрыхтоўка да зернаачышчэньня на мясцох пачалася з вялікім спазьненьнем. Асобныя раёны па некаторых акругах разгарнулі зернаачышчэньне не раней 15 лютага.

Адначасова са спазьненьнем падрыхтоўкі апошняя мела бяладны, няплянавы характар. Рамонт машын своечасова ня быў зроблен. Пляны зернаачышчэньня ў сельсаветах атрыманы позна. Арганізацыя абозаў спазьнілася. Сяляне своечасова ня былі паведамлены, калі ў тую ці іншую вёску прыбудзе абоз.

Пры павольным тэмпе арганізацыі абозаў большасьць з іх ня мела загадчыкаў. Абоз без загадчыка зьяўляўся зборышчам машын, аб скарыстаньні якіх ніхто ня думаў. Ня было зроблена дакладнага вучоту, і ня была своечасова дадзена нагрузка машынам савгасаў, калгасаў, машынных і насёлкавых таварыстваў, камітэтаў узаемадапамогі, загатоўчых пунктаў (сыжвецкае кааперацыі, Саюзхлеба, крэдытных таварыстваў).

Грамадзкая думка, якая так важна ў гэтым пытаньні, адсутнічала. Калі друк з усіх старонак крычаў аб зернаачышчэньні, дык сельсаветы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі, настаўніцтва—як правіла—бязьдзейнічалі. Былі, зразумела, выключэньні але яны ня ў стане былі паправіць сьпячку «рэспубліканскага маштабу». Праверка дырэктыў, даваемых з акругі ў раён і з раёну ў сельсавет, была нікуды ня годнай. А ў праверцы бадай асноўнае. Прызвычаеньне даць дырэктыву і забыцца аб праверцы выкананьня павінна быць рашуча адхілена, калі мы хочам узьняць ураджайнасьць.

Райвыканкомы і сельсаветы пасеўнай кампаніяй і ў прыватнасьці зернаачышчэньнем цікавіліся і цікавяцца вельмі мала. Толькі гэтым можна тлумачыць такія абуральныя факты, калі пляны пасеўкампаніі месяцамі ляжалі ў сталох ці партфелях старшынь РВК і чакалі свайго зацьверджаньня.

Пералічаныя прычыны, нам здаецца, трэба лічыць асноўнымі, калі мы разглядаем такія сумныя вынікі 4-х месячнай работы па ачыстцы насеньня.

Гэтыя вынікі робяцца яшчэ больш назначнымі, калі наглядзець на фактычную нагрузку машын. Апошнім пытаньнем, як відаць, у акругах і раёнах цікавяцца мала. А зацікавіцца трэба было-б! Калі ў 1927 г. працавала зернаачышчальных машын 1459, у 1928 годзе—1721, дык сёлета працуе 2364 машыны, у тым ліку 798 трыераў.

(Канец будзе).

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры СНК БССР

ПРА ДОЎГАТЭРМІНОВУЮ КАНТРАКТАЦЫЮ.

Эканамічная Нарада пастанаўляе:

1. Доўгатэрміновую кантрактацыю (ад 3 да 5 ураджаяў) утварыць у бягучым годзе ў выгладзе вопыту на плошчы 3.000 гектараў (бульба 1500 гектараў, лён 1000 гектараў, ячмень 200 гектараў, насенны матар'ял 300 гектараў) звыш аднагадовічнай кантрактацыі.

2. Доўгатэрміновая кантрактацыя павінна насіць выключна вытворчы характар і садзейнічаць рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

3. Доўгатэрміновую кантрактацыю праводзіць выключна ў калектыўных, пасяльковых гаспадарках, таварыствах і іншых вытворчых сельска-гаспадарчых аб'яднаньнях, як больш падрыхтаваных у агратэхнічных і вытворчых адносінах.

У дагаворах з пасеўшчыкамі на доўгатэрміновую кантрактацыю прадугледзіць:

а) абавязковае складаньне арганізацыйна-вытворчага пляну;

б) абавязковае ўвядзеньне правільнага шматпольнага севазвароту па ўказаньні мясцовага агранома;

в) абавязковы пасеў чыстасортным насеньнем;

г) унясеньне ў поўнай норме ўгнаеньня;

д) абавязковая зяблевая ўспашка і раньні майскі тар;

е) абавязковая і своечасовая ачыстка пасеваў ад сарнякоў.

4. Для пасьляховасьці кантрактацыі і абясьпечаньня правядзеньня пасеўшчыкам аказаных мерапрыёмстваў кантрактуючыя арганізацыі з свайго боку забясьпечваюць кантрактуючыкаў:

а) палепшаным насеньнем;

б) штучным угнаеньнем;

в) сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі;

г) агранамічным абслугоўваньнем;

д) хлеба-фуражом.

5. Фінансаваньне доўгатэрміновай кантрактацыі праводзіць:

а) штогоднім авансаваньнем гагоўкай на агравытворчыя затраты ў разьмерах, прадугледжаных на аднагадовую кантрактацыю;

б) доўгатэрміновым вытворчым крэдытам у разьмерах, забясьпечваючых выкананьне арганізацыйна-вытворчага пляну.

Арыентыровачна на гектар прадугледзіць 75 рубляў доўгатэрміновага крэдыту па ўсіх культурах.

6. Прапанаваць Беларускай Канторы Дзяржаўнага Банку і Белсельбанку забясьпечыць правядзеньне кантрактацыі пазбюджэтнымі сродкамі:

а) Канторы Дзяржбанку гатоўкай (штогоднае авансіраваньне):

па ільну	36.000 р.
па бульбе	60.000 „
па ячменю	8.500 „
на капюшоны	6.250 „
па лубіну	3.300 „
	116.050 р.

б) Белсельбанку—вытворчымі доўгатэрміновымі крэдытамі ў суме 225.000 руб.

Грашовыя авансы выдаюцца пасеўшчыкам бяспроцантна, а доўгатэрміновыя вытворчыя крэдыты—па існуючых процантных стаўках Белсельбанку.

7. Пагашэньне крэдытаў праводзіць наступным парадкам:

а) грашовыя авансы спагашаюцца поўнасьцю штогод пры здачы закантрактаванай прадукцыі;

б) вытворчыя крэдыты пагашаюцца на працягу дзейнічаньня дагавору роўнымі часткамі штогод.

8. Разьмер здачы закантрактаванай прадукцыі па пасобных культурах на 1929 год вызначыць у колькасьці, прадугледжанай для аднагадовай кантрактацыі.

У наступныя гады колькасьць здаваемай прадукцыі павінна павышацца у адпаведнасьці ад павялічэньня ўраджайнасьці штогод ад 7 да 10 проц.

9. Разьлік за здаваемую прадукцыю ўтварыць па цэнах, якія будуць устаноўлены Н. К. Гандлю для году здачы.

10. Устанавіць наступныя тэрміны штогодніх здач закантрактаванай прадукцыі:

па ільну—да 1-га лютага
па бульбе—да 15-га лістапада,
па ячменю—да 1-га сьнежня,
па насеньню—да 1-га лютага.

11. Прапанаваць Н. К. Гандлю па ўзгадненьні з Белсельсаюзам, Н. К. Земляробства і Белсельбанкам выдаць на падставе гэтага адпаведную інструкцыю.

Старшыня Эканамічнай Нарады БССР М. Карнілін.
Сакратар Эканамічнай Нарады БССР В Крывіцкі.

18 лютага 1929 г.
г. Менск.

У Эканамічнай Нарадзе БССР.

Аб пабудове тыпізаванай газэтнай друкарні ў г. Менску.

Адным з галоўных моментаў рацыяналізацыі газэтнай гаспадаркі (зьяўляецца падняцьце тэхнікі тыпаграфскага афарміленьня газэт. Зрабіць-жа гэта магчыма толькі пры канцэнтрацыі газэтна-друкарскае справы ў аднэй тыпізаванай друкарні, арганізаванай на высокай тэхніцы

Раскіданасьць друкарань і іх рэдакцый зьвязана з цэлым шэрагам накладных выдаткаў як на ўтрыманьне абслугоўваючага пэрсаналу, так і іншае. Такое становішча бязмоўна робіць уплыў на ўдаражаньне сабекаштоўнасьці прадукцыі.

З утварэньнем цэнтральнай газэтнай друкарні ў Менску паміма вымяшчэньня каштоўнасьці газэт—гэта дасьць яшчэ магчымасьць палепшыць і самую пастаноўку работы ў рэдакцыях газэт. Для абсталяваньня тыпізаванай газэтнай тыпаграфіі неабходна пабудаваць спэцыяльнае памяшканьне з прычыны таго, што ні адно з маючыхся ў Менску памяшканьняў ня можа быць прыстасавана для гэтай мэты.

Пры разгледжаньні гэтага пытаньня ЭКАНА прызнала мэтазгодным пабудову тыпізаванай друкарні і адначасова з гэтым пастанавіла: пабудову яе пачаць не пазьней красавіка 1930 году і скончыць працу праз 2 гады.

Уся работа па падрыхтоўцы і пабудове друкарні ўскладзена на ВСНГ БССР, які на працягу 1929 году павінен распрацаваць і зацьвердзіць у належных інстанцыях усе тэхнічныя работы.

Разам з гэтым запрапанавана ВСНГ на працягу 2-х месяцаў распрацаваць і падаць у ЭКАНА план фінансаваньня пабудовы друкарні, а таксама ўнесьці свае прапановы аб далейшым існаваньні менскіх друкарняў.

ПРА ВАПНАВАНЬНЕ ГЛЕБЫ.

Наркамзэмяробства на працягу бліжэйшых пяці год намецію правесьці вапнаваньне глебы ў 4 акругах: Менскай, Магілёўскай, Бабруйскай і часткова Аршанскай—з агульнай пасеўнай плошчай каля 2.000.000 гектараў. Акругі з пясчанымі глебамі, а таксама і тыя раёны, у якіх развіта ільнаводзтва, пакуль што ў план ня ўключаны ў зьвязку з тым, што пытаньне аб уплыве вапны як на прадукцыйнасьць, так і якасьць ільна-валакна пакуль што мала вывучана. Акрамя плошчы стара-воравых зямель прадпалагаецца ўжыць вапнаваньне і на ўноў асушаных моховых балотах і на сенажацях.

Вапнаваньне глебы на Беларусі да 1929 году ня ўжывалася.

Эканамічная Нарада пастанавіла; правесьці вапнаваньне глебы ў 1929 годзе на плошчы 25.0000 гект. з якіх 5.000 гект. вапнаваць улетку, а 20.000 гект.—увосень. З прадназначанай агульнай колькасьці плошчы для вапнаваньня ў 1929 годзе 12.000 гект адносьці на аграмаджаны сэктор, а астаўшуюся рэшту на індывідуальныя гаспадаркі.

Маючы на ўвазе, што вапнаваньне плошчы ў 1929 годзе зьяўляецца першым масавым досьледам, неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на кіраваньне і вучот вынікаў гэтай спробы.

Пытаньне аб арганізацыі летніх курсаў для аграномаў з мэтай палепшаньня іх кваліфікацыі па пытаньню мінэралізацыі глебы даручана распрацаваць Наркамзему.

Наркамзему і Інстытуту імя Леніна даручана ў тэрмінёвы тэрмін распрацаваць спэцыяльную інструкцыю па вапнаваньню глебы.

Для правядзеньня гэтай работы ЭКАНА даручыла НКРСІ ў тыдзёвы тэрмін устанавіць для Наркамзема і Белсельсаюзу штат па вапнаваньню, падтрымаўшы хадайніцтва Наркамзему перад СНК БССР аб водпуску на гэта адпаведных сродкаў. Адначасова даручана Наркамзему тэрміновa врабіць захады аб адводзе для с-г. кампэнсацыі зямельных вучасткаў для эксплёатацыі вапны, крэйды і мэргеля.

„Сав. Беларусь" дапамагла.

ЗАМОЖНІКІ ВЫКЛЮЧАНЫ З ПРАФСАЮЗУ.

У допісе „Такім ня месца" паведамляла ся, што ў Лагойскім лясьніцтве служыць у якасьці лясьніка заможнік Мамейка, які таксама зьяўляецца членам прафсаюзу. Пасьля расьсьледаваньня факты пацьвердзіліся: Мамейка, а разам з ім і іншыя заможнікі, выяўленыя райкомам саюзу прац зямлесу, звольнены з працы і выключаны з саюзу.

КУЛАКІ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

У допісе «Помста заможнікаў» паведамлялася аб тым, што ў вёсцы Капуры, На паткевіцкага раёну, кулакі рабілі напад на камсамольца Пілікуса. Допіс быў накіраваны на расьсьледаваньне. Факты пацьвердзіліся; віноўныя прыцягнуты да судовай адказнасьці.

ЗЛАЧЫНЦЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў СПРАЎДОМЕ.

У допісе „Чаму на другому", зьмешчаным у № 36 за 15-2, паведамлялася, што б. пам. лясьнічага Курманаўскага лясьніцтва быў перададзен вучастак лесу мясцовага значэньня былому абшэрніку Мольнікаву ў арэнду. Мельнікаў гэты лес цалком вырубіў. Факты пацьвердзіліся. Абшэрнік Мельнікаў, аб'ездчык (б. пам. лясьнічага) Сіўцэвіч арыштаваны і знаходзяцца ў папраўчым доме.

Двухтыднёвік ашчаднасьці.

Смалявіцкі раён адстае.

У Смалявіцкім раёне да 5-ІІ усяго ўцягнута 145 укладчыкаў і 3027 руб. укладаў, што складае ў адносіне да кантрольных заданьняў па ўкладчыках—17,5 проц. і па ўкладах—11,5 проц.

Забалацкі сельсавет і іншыя сельсаветы да гэтага часу не з'арганізавалі камісій садзейнічаньня, не разьмеркавалі кантрольных лічбаў укладчыкаў і сумы ўкладаў па кожнаму насяленаму пункту, ня вылучаны вярбоўшчыкі для вярбоўкі ўкладчыкаў у касу ашчаднасьці і не абгаварылі гэтага пытаньня на пленумах сельсавету і сходах сялянства.

У зьвязку з такімі нязначнымі вынікамі РВК і раённая камісія дала катэгарычныя дырэктывы ўсім сельсаветам аб узмацненьні кампаніі і прыняцьці мер да выкананьня заданьняў.

Сярод рабочых савгасу Цімкавічы няма ніводнага ўкладчыка.

Для правядзеньня растлумачальнай працы сярод рабочых савгасу Цімкавічы, загадчык Цімкавіцкай ашчадкасы дагаварыўся з старшынёй рабочкому савгасу аб пастаноўцы пытаньня аб ашчаднай справе на агульным сходзе рабочых.

Калі загадчык касы зьявіўся на сход, прадстаўнік цэнтр. праўленьня саюзу сельгаспрабочых тав. Альперын, які быў на гэтым сходзе, заявіў, што „у віду перагружанасьці абвесткі, пытаньне аб 2-хтыднёвіку ашчаднасьці паставіць немагчыма".

Старшыня рабочкому савгасу абяцаў паведаміць загадчыка касы аб наступным сходзе рабочых, але-ж да гэтага часу гэта пытаньне так і не пастаўлена, і сярод рабочых савгасу няма ніводнага ўкладчыка. К.

Двухтыднёвік пад пагрозай зрыву.

(Дрыса, Полаччына).

Ашчадная справа ў Дрысенскім р-не пашыралася недапусьціма павольным тэмпам, асабліва на вёсцы. Тут за 3 гады ўцягнута ўсяго толькі... 19 сялян (!). Камэнтарыі не патрэбны. Мясцовыя арганізацыі ашчаднай справай ня цікавіліся, яны, нават, амаль не заслухоўвалі дакладаў. Пляны, бязмоўна, не адбівалі пытаньняў ашчаднасьці. Выходзячы з гэтага здавалася-бы, што двухтыднёвік павінен зрабіць рашучы пералом. Але, здарылася наадварот.

Падрыхтоўка да двухтыднёвіка была распачата 14-15-ІІ. Складзен прыгожы добры плян, адказнасьць за выкананьне якога ўскладзена на... загадчыка пошты. Камісія садзейнічаньня пры РВК нічога ня робіць. Яна ня ведае ці пры ўсіх сельсаветах арганізаваны камісіі, ці ведуць яны якую працу. На запытаньне, як выконваюцца кантрольныя лічбы—старшыня камісіі адказаў:—«Я ня ведаю».

Пры саюзных арганізацыях таксама ёсьць камісіі садзейнічаньня, але вылучаныя ў іх працаўнікі да гэтага часу ня ведалі аб гэтым. У саюзе с-г. рабочых сакратар—сябра камісіі ня ведаў, што ў старшыні саюзу маецца плян двухтыднёвіка. Камісія ня ў местачковым савеце, нават, зусім згубіла плян. —Ня ведаем, што нам трэба рабіць,—кажуць сябры гэтай камісіі.

Настаўнікі таксама нічога ня робяць.

— Пустая справа,—кажа адзін з іх на прапанову рабіць абход двароў.

— У сялян і грошай няма,—гаворыць старшыня камісіі пры РВК.

Па местачку няма ніводнага лёзунгу, ніводнага плякату, няма гэтага і ў нардоме.

—Сьцены ня хочам пэцкаць,—заявіў заг. нардому.

Па саюзах сходы не праведзены. Былі выпадкі зрываў сходаў за няўдалай дакладчыкаў.

З боку райкому КП(б)Б, райвыканкому і прафсаюзаў адчуваецца поўная безадказнасьць да правядзеньне двухтыднёвіка.

— У нас ёсьць шмат іншых кампаній, часу няма,—кажа сакратар райкому. У выніку гэткай „увагі" двухтыднёвік знаходзіцца пад пагрозай зрыву. За тры тыдні плян выканан па ўкладчыках на 12,2 проц., па ўкладах на 19,2 проц.

АВК і АСНС трэба больш уважліва аднесьціся да двухтыднёвіка, чаго зараз няма. Мік. С.

Хаты-чытальні і папулярызацыя новага закону аб с.-г. падатку.

Зараз ва ўсю шырыню пастаўлена пытаньне аб падняцьці ўраджайнасьці. Уся савецкая грамадзкасьць прыцягнута да гэтае надзвычайна важнае і адказнае задачы. К гэтаму-ж часу выдадзен і новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку, які прадугледжвае шэраг ільгот для бяднацка-серадняцкіх гаспадарак і спрыяе ў поўнай меры перабудове сельскае гаспадаркі на сацыялістычны лад.

Аб новым законе і ўсіх ільготах, якія прадугледжаны ім, павінны ведаць усе шырокія бяднацка-серадняцкія масы.

Палітыка-асьветныя ўстановы вёскі (хаты-чытальні, чырвоныя куткі, вячэрнія школы сялянскае моладзі, бібліятэкі і інш.) усю ўвагу павінны зьвярнуць на папулярызацыю сярод працоўнага насельніцтва новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку.

Папулярызацыя закону ў першую чаргу павінна праводзіцца шляхом гутарак з сялянамі па пытаньнях падатку і галосных чытак адпаведных артыкулаў аб новым законе з газэт «Савецкая Беларусь», „Беларуская Вёска" і інш. Апроч таго пажадана пры данамозе сельсавету наладзіць некалькі сялянскіх сходаў, а таксама скарыстоўваць для папулярызацыі новага закону ўсе іншыя сялянскія сходы.

Шырока трэба разгарнуць на гэты час і справачную працу. Дзяжурныя ў справачных сталох павінны адбываць рогулярна. Там-жа трэба сканцэнтраваць усю літаратуру і матар'ялы аб новым законе Апроч таго, справачны стол пры данамозе сельсавету павінен па вёсках наладзіць шэраг вечароў пытаньняў і адказаў на тэму „якія ільготы дае беднаку і серадняку новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку».

У насьценнай газэце неабходна вылучыць асобны разьдзел, прысьвечаны новаму закону. Добра было-б, каб хаты-чытальні таксама пакланаціліся своечасова набыць для масавага чытаньня і літаратуру па гэтаму пытаньню.

Усю працу па папулярызацыі новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку трэба цесна ўвязаць з кампаніяй падвышэньня ўраджайнасьці.

М. Сэўрук.

Шаўкоўніцтва ў БССР.

Тав. ЗЬБІТКОЎСКІ, у гутарцы з нашым супрацоўнікам, аб перспэктывах разьвіцьця шаўкоўніцтва ў БССР паведаміў наступнае.

— Усесаюзны тэкстыльны сындыкат уключыў БССР у райёны шаўкоўніцтва—побач з Украінай, Паўночным Каўказам, Далёкім Усходам і інш.

Асноўнымі мерапрыёмствамі па разьвіцьцю шаўкоўніцтва ў 1929 г. павінна быць: загатоўка і дастаўка грэны, поўны вучот кармавых рэсурсаў у новых раёнах, арганізацыя курсаў па падрыхтоўцы інструктароў, выданьне папулярнай літаратуры, распрацоўка канкрэтных планаў арганізацыі гадавальнікаў морвы і г. д. Апроч таго намечана шырока ўцягнуць у гэту справу настаўніцтва, падрыхтаваць спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, дзеля чаго ў ВНУ гэтых райёнаў павінны быць уведзены адпаведныя дысцыпліны і праграмы па шаўкоўніцтву. Дзеля азнаямленьня вучнёўскай моладзі з пастаноўкай шаўкоўніцтва трэба ўвесьці ў праграму пачатковых школ выкладаньне гэтага прадмету.

Пытаньне гэта разглядалася ў Наркамгандлю СССР, дзе згадзіліся з гэтымі мерапрыёмствамі.

У БССР сёлета, на прыкладу мінулага сезону, будзе выпісана шаўкавічная грэна, якая будзе разьмяркоўвацца па тых пунктах, дзе ўжо маюцца зарасьніі морвы. Галоўнымі пунктамі зьяўляюцца Мазыршчына і Гомельшчына, дзе ёсьць досыць морвы, але грэна будзе раздавацца і ў інш. пункты.

Зусім слушна, што тых 500 руб., якія асыгнаваў на гэту справу ВСНГБ, ня хопіць на гэтыя опыты, а іншыя інстытуцыі пошта ня хочуць адгукнуцца на гэта мерапрыёмства.

Што шаўкоўніцтвам пачынаюць усё больш цікавіцца, сьведчыць хоць-бы тое, што з Смаленскай губ. зьвярнуліся да нас з просьбай прадаць ім 5000 саджанцаў морвы, а ў нас нават ніхто ня хоча пацікавіцца лёсам гадавальніка морвы.

ХРОНІКА.

Старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў выехаў у Маскву.

Старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў гэтымі днямі выехаў па справах у Маскву, дзе прабудзе некалькі дзён.

Тав. Яраслаўскі — ганаровы член гарсавету.

На перавыбарным сходзе рабочых фабрыкі «Адраджэньне» т. Яраслаўскі абраны ганаровым членам Менскага гарсавету.

Амэрыканская рабочая дэлегацыя ў тав. Чарвякова.

У панядзелак, 11-га сакавіка, амэрыканская рабочая дэлегацыя наведала Старшыню ЦВК БССР т. Чарвякова і мела з ім доўгую гутарку па шэрагу пытаньняў. Тав. Чарвякоў пазнаёміў дэлегатаў са становішчам рабочае клясы ў Савецкім Саюзе.

11-га сакавіка ўвечары, у клюбе Леніна адбылося сяканьне дэлегацыі з рабочымі г. Менску.

Аб стане рабочае клясы ў Амэрыцы выступіў з дакладам член дэлегацыі тав. Юдзіч. Ён намаляваў жудасную карціну эксплёатацыі рабочых.

З аднаязным словам выступалі т. т. Ашаровіч, Агурскі і цэлы шэраг рабочых.

Учора члены амэрыканскай рабочай дэлегацыі выехалі на бацькаўшчыну.

ПЕРАВЫБАРЫ ГАРСАВЕТАЎ АКРУГОВЫХ ГАРАДОЎ.

(Зьвесткі даюцца ад 11 сакавіка).

Перавыбары адбыліся па 168 вучастках, на тэрыторыі якіх знаходзіцца 21.355 выбаршчыкаў, з якіх 8.177 жанчыны. Зьявіліся на выбары 78,3 проц. выбаршчыкаў (процант жанчын 76,7). Усяго абрана 664 сябры гарсавету, з іх 174 жанчыны, альбо 26,2 проц. да агульнай колькасьці.

Па партыйнасьці абраныя падзяляюцца: 45,3 проц. камуністаў, 9,6 камсамольцаў. Па нацыянальнасьці—47,3 проц. беларусаў; 39,2 проц. яўрэяў; 8,1 проц. расейцаў; 1,6 проц. палякаў і 3,8 проц. іншых.

Праз касы ашчаднасьці ўзмацнім сацыялістычнае будаўніцтва.

Работа сярод чырвонаармейкаў і камсалітэкладу на ўцягненьні ў касу ашчаднасьці ў № чырвонаштандартным палку пачалася з лютага месяца.

На гэту тэму быў пастаўлен на агульным сходзе інфармацыйны даклад адказнага сэкратара бюро калектыву і зараз ведзецца вярбоўка ўкладчыкаў. За гэтыя дні ўжо завербавана звыш 50 чалавек укладчыкаў. У ходзе кампаніі ў палку будзе адчынена каса ашчадкасьці.

У Доме Пісьменьніка.

(Са сходу пісьменьнікаў г. Менску).

10 сакавіка ў Доме Пісьменьніка адбыўся агульны сход пісьменьнікаў г. Менску.

Сход абраў праўленьне Дому Пісьменьніка. У склад праўленьня абраны т.т. М. Грамыка (Галоўмастацтва), Я. Колас, Крапіва, Іл. Барашка, В. Каваль, В. Сташэўскі і Вітэнзон. Кандыдатамі абраны т. т. З. Бядарына і З. Бядуля.

Рэвізійная камісія абрана з т. т. А. Александровіча, М. Хведаровіча і А. Бабарэкі. Кандыдатам абраны К. Чорны.

На сходзе ўхвалена лічыць Дом Пісьменьніка месцам літаратурна-грамадзкай працы і грамадзкага адпачынку ўсіх пісьменьнікаў г. Менску.

Сход дазволіў праўленьню, часова, да адрамантаваньня другога паверху, даць у Доме пёўнае мейсца для працы рэдакцыям «Маладняка» і „Узвышша", а таксама для працы сакратарыятаў літаратурных аб'яднаньняў, не адводзячы асобных пастаянных пакоў.

Па пытаньню аб статуце Дому сход ухваліў даручыць праўленьню на працягу месяца скласьці статут Дому.

Адчыненьне Дому мае адбыцца ў наступным месяцы.

Забесьпячэньне гарадоў гароднінай.

За апошні час назіраецца ўзмоцнены попыт на гародніну, асабліва на бульбу. У сувязі з гэтым дадзена заданьне скажэнкай кампэрацыі ў пэрыяд сакавік-красавік заготовіць 4000-5000 тон бульбы, якая будзе перададзена ЦРК.

Белрабсэкцыя зараз прапрацоўвае плян заготовак гародніны на будучы год. Плянам прадугледжана заготовіць для рабочай кампэрацыі 2000 тон капусты, 14000 тон бульбы, 6500000 агуркоў і каля 1500 тон буракоў, морквы, цыбулі і іншай гародніны.

С СЁНЬНЕШНІМ НУМАРАМ НАШАЕ ГАЗЭТЫ РАССЫЛАЕЦЦА БЯСПЛАТНА ДАДАТАК «САВЕТЫ БЕЛАРУСІ» № 3 (7).

Культурныя навіны.

Мантаж археолёгічнага аддзелу БДМ.

Зараз у БДМ праходзіць мантаж усіх рэчаў па археолёгіі прывезіцца нагоўт у парадак увесь археолёгічны аддзел. Таксама распачынаецца праца па мантажыраваньню аддзелу этнаграфіі, які закончыцца толькі ў наступным годзе.

Фаўністычныя досьледы ў БССР.

У харкаўскім навуковым т-ве быў заслуханы даклад Зы. Зайцева, выдатнага ўкраінскага зоолёга і крайнаўцы на тэму „фаўністычныя досьледы ў БССР". Даклад быў зроблены на падставе асабістага вывучэньня Зайцевым гэтага пытаньня ў часе яго прабываньня ў Менску.

Украінскія вучоныя выказалі зацікаўленасьць да гэтага дакладу. Было ўказана больш сьцісла зьвязацца з беларускімі навуковымі і прыродазнаўчымі інстытутамі.

Апавяшчэньні.

ЛЕКЦЫЯ ПРАФ. ЛЕНЦА—«Новыя шляхі изучения человека» адбудзецца ў суботу, 16 сакавіка, роўна а 7 гадзіне ўвечары ў будынку Беларускай цэнтральнай дасьледчай школы—Савецкая 118|14, ход з Савецкай.

Білеты ў касе 1-й кнігарні БДВ рог. Савецкай і Ленінскай.

СХОД МЕНСКАЙ ФІЛІІ БелАПП.

У пятніцу, 15-га сакавіка, а 7 гадзіне ўвечары ў залі Дому Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца чарговы сход Менскай філіі Беларускай Асацыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў.

На парадку дня: 1) даклад члена БелАПП А. Сяньковіча «Вынікі XII зьезду КП(б)Б і задачы культурнага будаўніцтва», 2) даклад прадстаўніка Белдзяржвыдавецтва т. І. Цьвікевіча «Праблема дзіцячай кнігі».

На сход запрашаюцца пісьменьнікі іншых літаратурных аб'яднаньняў і настаўнікі — выкладчыкі беларускай літаратуры.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня роўна а 8-й гадз. увечары агульны сход асьветрінаў гор. Менску. На абвестцы дню—даклад аб працэсе Беларускай Грамады.

ПЭДГАБІНЭТ.

16-3 а 8 гадзіне вечара адбудзецца сход сяброў пэдагабінэту—пэдагагічнай асацыяцыі. Даклад т. Перабіліа «Назукова-дасьледчая праца на педаг. у Амэрыцы». Запрашаюцца сябры секцыі, настаўнікі, дактары і ўсе жадаючыя.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ВЫШЛА З ДРУКУ, РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ І ПАСТУПІЛА У ПРОДАЖ № 2

ПОЛЫМЯ

БЕЛАРУСКАЯ ШТОМЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ ПОЛІТЫКІ ЭКОНОМІКІ ГІСТОРЫІ КРЫТЫКІ

ЗА 1929 ГОД.

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ:

А. Валіцкага, Я. Васілевіча, З. Жылуновіча (адказны рэдактар), Я. Купалы, М. Чарота.

ЗЬМЕСТ:

Гартны Цішка. Здароньне з камісарамі—*Апавяданьне.*
Нарлінскі С. Плакаці бярозы—*Апавяданьне.*
Галоўка А. Таварышы—*Апавяданьне.*
Купала Янка. Недрукаваныя дарэвалюцыйныя творы—*Вершы*
Колас Якуб. На шляхох волі—*Паэма.*
Александровіч А. Нараджэньне чалавека—*Раман* (працяг).
Моркаўка Аркадзь. Колькі жыць нам—*Верш.*
Быхаўскі Б. Фармальна-мэтафізычная лёгіка.
Цьвікевіч Ал. «Западно-русская» школа і яе прадстаўнікі (працяг).
Каган Я. Франц Мэрынг.
Вазьнясенскі А. Ля вытокаў мастацкай прозы Якуба Коласа (працяг).
Полін М. Зарысоўкі ў падарожжы.
Цьвікевіч Іван. Трэцяя ўсебеларуская мастацкая выстаўка.
Кальтофэн Р. Сучасная юга-скаўская літаратура.
Кнігапіс
Хроніка беларускай культуры.
Хроніка ўкраінскага культурнага жыцьця.
Хроніка культурнага жыцьця замежных краін.

Гадавыя падпісчыкі на часопісь „ПОЛЫМЯ" атрымліваюць, па падпісных квітках, пры пакупцы мастацкай і палітычнай літаратуры выданьняў БДВ у ўласных кнігарнях БДВ ільготы: на агульную суму да 30 руб.—скідку ў 25 проц., а поўгадавыя на суму да 20 руб.—скідку—15 проц.

Акрамя таго, падпісчыкам на „ПОЛЫМЯ" на 1929 год даецца растэрмінаваньне з уплатаю гадавым: пры падпісцы—5 р., да 1-га ліпеня—4 р. і да 1-га кастрычніка—3 р. Поўгадавым падпісчыкам: пры падпісцы—4 руб. і да 1-га чэрвеня—2 руб. 50 кап.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА.

На год	12 р.—к.	На 3 месяцы	3 р. 25 к.
„ 6 месяцаў	6 „ 50 „	Цана асобнага нумару	1 „ 25 „

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У рэдакцыі часопісі «ПОЛЫМЯ» (Менск, Савецк. 63, Белдзяржвыдавецтва), у цэнтральнай кнігарні БДВ (Менск, рог. Ленінскай і Савецкай), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ, у аддзеле падпіскі Беларускага Аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая 54) і яго агэнтурай на акругах і раёнах, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і аддзяленьнях, у Беларускім аддзяленьні Выдавецтва „Известия" ЦИК і „Правда" (Менск, Савецкая, 61) і яго пададдзяленьнямі (Гомель, Савецкая, 17; Віцебск, Ленінская, 11), а таксама і контрагэнтамі (Бабруйск, Магілёў, Жлобін), у канторы газэты „Бел. Вёска" (Менск, Савецкая, 63) і не ўпаўнаважан. і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

ЧАЦЬВЕР, 14-га САКАВІКА

На карысьць шэфтаварыства саюзу харчавікоў.

„ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ".

Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 12 сакавіка ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК „РЭЙНСКІ БУНТАР" У 8 частках. Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ „ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ" У 8 ЧАСТКАХ ПАЧАТАК А 7 ГАДЗІНЕ.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». „КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА" Пачатак а 3 і 5 гадзіне. ЦАНА БІЛЕТУ 10 КАП.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка 12 сакавіка Мастацкі гістарычны баявік „КАХАНЬНЕ НАПОЛЕОНА" У 8 ЧАСТКАХ.

Усебеларуская Кантора Дзяржбанку даводзіць да ведама, што з 15-га сакавіка 1929 г. у г. РАГАЧОВЕ, Бабр. акругі, адчыняецца агэнцтва Дзяржбанку

ЯКОЕ БУДЗЕ ВЫТВАРАЦЬ:

УСЕ АПЭРАЦЫІ з каштоўнымі паперамі, пакупку каштоўных мэталяў і замежнай валюты, прыём і выдачу грошай па бягучых рахунках і ўкладах, пераводаў і інкасовых даручэньняў і прыём падатку.

ВЫШЛА З ДРУКУ:

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

(працэс Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады)

НА БЕЛАР. МОВЕ.

Стар. 254. Цана 1 р. 50 к.

Белдзяржвыдавецтва.

Менск, Дзяржаўная друкарня.